№ 21 (619) 3 чэрвеня 2009 www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



## Ахоўнік прэзідэнта

Старонка 3

## Апошні салдат банды Марозава

Старонка 9



## Пад каго стваралася ВКЛ

Старонка 13


### У НУМАРЫ

**На МУС паставілі алі-байрамлінскага**

Кіраўніком Міністэрства ўнутраных справаў прызначаны генерал-маёр Анатоль Куляшоў. **Старонка 2.**

**Андрэй Арамнаў: «Я больш так не буду»**

«Я аформіў дакументы на ўласны легкавік, у выніку чаго не стрымаўся і выпіў піва». **Старонка 8.**

**Алена Макоўская**

і прываднyя рамяні партыі. **Старонка 5.**

**«Опель» стане расійскай машынай**

Навіны гаспадаркі. **Старонка 4.**

**«Беланогая — гэта адкрыццё»**

лічыць Сяржук Сокалаў-Воюш. **Старонка 12.**


«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Дэвальвацыя: МВФ не настойвае, але...

### «прапануе пэўную гнуткасць ва ўстанаўленні валютнага курсу».




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Міжнародны валютны фонд — вось ад каго па стане на 2009 год залежыць фінансавая сістэма Беларусі. Краіна спажывае больш, чым зарабляе, і таму ёй, як вада, патрэбныя замежныя запазычванні. Да апошняга году яны надыходзілі з Расіі пад палітычныя ўмовы. Ад гэтага году Беларусь адкрыла кранік з другога боку. Менавіта МВФ парэкамендавала Беларусі выканаць разавую дэвальвацыю рубля на 25% у пачатку году. Бачанні МВФ будуць вызначальнымі і надалей.

«Мы будзем выконваць дамоўленасці з МВФ, але фанатычна і літаральна выконваць іх рэкамендацыі не настроеныя», — заявіў лукашэнкаўскаму агенцтву «Інтэрфакс» «суразмоўца ў банкаўскай сістэме». Гэтым эўфемізмам пазначаецца хтосьці, хто мае дачыненне да прыняцця рашэнняў у гэтай сферы. Суразмоўца нагадаў, што ў працэсе перамоваў з МВФ у красавіку з ініцыятывы Фонду абмяркоўвалася магчымая дэвальвацыя рубля яшчэ на 10%, але беларускі бок не пагадзіўся на гэтую меру, каб не падрываць даверу да нацыянальнай валюты.

Крыніца паведаміла, што курс беларускага рубля да кошыка валют будзе зафіксаваны, калі дасягне найніжэйшай 5%-най мяжы. Мяжа была акрэсленая ў студзені гэтага году, калі ўлады ўсталявалі дазволены дыяпазон вагання курсаў. Пры курсе еўра да даляра 1,3 курс даляра дасягне пры гэтым прыкладна 2900 рублёў.

Са свайго боку, пастаянная прадстаўніца МВФ у Беларусі Наталля Калядзіна заявіла, што ўрад Беларусі і эксперты МВФ узгаднілі большасць пазіцый у межах праграмы stand-by падчас апошняга візіту ў Мінск, і цяпер гэтая праца працягваецца. Міжнародны валютны фонд можа перавесці Беларусі другую частку крэдыту ў памеры каля $400 млн у канцы чэрвеня ў выпадку поўнага ўзгаднення.

«Па сутнасці, мы дамовіліся з уладамі па ўсіх асноўных пытаннях, за выняткам усяго некалькіх», — сказала Н.Калядзіна ў інтэрв'ю агенцтву Прайм-ТАСС. Паводле яе словаў, беларускім уладам «спатрэбіўся час абдумаць тыя варыянты, якія ім былі прапанаваныя, і прыняць рашэнне».

**Працяг на старонцы 4.**



**Маршруты па Беларусі: ваўкавыская готыка**

**Старонка 10.**

# «Мы можам сутыкнуцца з неплацежаздольнасцю ўраду»

28 мая ў Мінск прылятаў Уладзімір Пуцін. Візіт расійскай дэлегацыі скончыўся чарговым скандалам у двухбаковых адносінах. Міністр фінансаў суседняй дзяржавы Аляксей Кудрын абвінаваціў саюзнікаў у неплацежаздольнасці, а Лукашэнка загадаў ураду спыніць паклоны ў бок Расіі і пачаць шукаць шчасце ў іншай частцы планеты.

Найгалоўнымі пытаннямі пасяджэння савету міністраў саюзнай дзяржавы былі разгляд пытанняў паставак беларускай сельскагаспадарчай тэхнікі ў Расіі, а таксама атрыманне нашай краінай апошняй траншы расійскага крэдыту ў памеры 500 мільёнаў даляраў. Напярэдадні віцэ-прэм'ер Андрэй Кабякоў паведаміў журналістам, што Беларусь гатовая да атрымання крэдыту, слова за расіянамі.

Аднак яшчэ перад прыездам Пуціна расійская прэса пісала, што пасяджэнне можа скончыцца нечаканкай. «Афіцыйны парадак дня сённяшняга пасяджэння Саўміну саюзнай дзяржавы выглядае бяскрыўдна і нават руцінна. Аднак, улічваючы тыя выпады, якія за апошні час спадар Лукашэнка зрабіў у адрас спадара Пуціна, сённяшнія перамовы абернуцца або сенсацыйнымі дамоўленасцямі, або грандыёзным скандалам. Масква хоча абмяняць крэдыты для Мінска на доступ да беларускага паліўна-энергетычнага комплексу», — пісаў «КоммерсантЪ».

**Працяг на старонцы 3.**

# Аддаюць апошнюю кашулю

**Расходы і даходы краіны на 2008 год зведзеныя дзякуючы ўключэнню ў бюджэт краіны Рэзервавага фонду прэзідэнта, які раней размяркоўваўся непразрыста.**

Указам А.Лукашэнкі ад 28 мая №264 перагледжаныя паказчыкі бюджэту краіны на 2009 год. Даходы і расходы зацверджаныя ў суме 54,9 трлн руб. пры нулявым дэфіцыце.

Для параўнання, летась даходы нацыянальнага бюджэту склалі 48,12 трлн руб., або 22,4 млрд у пераліку на даляры. Сёлетні паказчык па цяперашнім курсе адпавядае 19,6 млрд даляраў.

Аднак даходы бюджэту за першы квартал склалі толькі 9,9 трлн рублёў, або на 5,6% менш чым у тым жа перыядзе 2008 году. З гэтага можна зрабіць прагноз, што гадавыя даходы складуць каля 46 млрд. Чым жа пакрыецца розніца — ні многа ні мала 8 трыльёнаў?

У Мінфіне адзначылі, што намінальнае захаванне даходнай часткі бюджэту тлумачыцца ўключэннем у склад бюджэту рэзервавага фонду прэзідэнта Беларусі, які раней знаходзіўся па-за рамкамі бюджэтнага працэсу. У Мінфіне падкрэсліваюць менавіта намінальны характар гэтай бюджэтнай аперацыі, бо, як і раней, распараджацца рэзервавым фондам будзе выключна А.Лукашэнка.

Такім чынам, каб выканаць патрабаванне МВФ пра бездэфіцытны бюджэт, Мінфін ускосна назваў і аб'ём рэзервавага прэзідэнцкага фонду, за кошт якога ўдаецца захаваць бюджэт бездэфіцытным — гэта 8 трлн рублёў, ці каля 2,8 млрд даляраў. Раней таямнічым быў сам фонд і спосабы яго фармавання. Цяпер сакрэтам застаецца механізм уключэння гэтага таямнічага фонду ў бюджэт.

Затое памер назапашаных сродкаў уражвае. «Адкуль такія грошы? — дзівуецца эканаміст Яраслаў Раманчук. — Летась планаваныя даходы фонду складалі 600 млн даляраў».

**Мікола Бугай**

## СЦІСЛА

### Аднавілі ва універсітэце, пасля розгаласу ў СМІ

Актывіста Маладога Фронту Пятра Рузава, якога адлічылі з 1 курсу Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, аднавілі на вучобе. Яго адлічылі пасля таго як прысудзілі да штрафу за нанясенне графіці «Свабоду Аўтуховічу» на будынак гарадскога мясакамбінату. На думку Рузава, прычынай аднаўлення стаў рэзананс у СМІ.

### Мора не маем, то хоць паназіраем

Беларусь можа атрымаць статус назіральніка ў Радзе дзяржаваў Балтыйскага мора. «Беларусь гістарычна і геаграфічна ўсё ж з'яўляецца ў некаторай ступені балтыйскай краінай», — сказаў пасол Швецыі ў Беларусі Стэфан Эрыксан.

**СП**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# На МУС паставілі алі-байрамлінскага

**Міністрам унутраных справаў стаў генерал-маёр Анатоль Куляшоў.**

Нечаканасцяў не адбылося: новым кіраўніком Міністэрства ўнутраных справаў прызначаны выконваючы абавязкі міністра генерал-маёр Анатоль Куляшоў **(на фота злева)**.

Прагнозы, што гэтую пасаду можа заняць старшыня Памежнага камітэту Ігар Рачкоўскі ці начальнік мінскай міліцыі Леанід Фармагей, не спраўдзіліся.

Яшчэ год таму Анатоль Куляшоў узначальваў сталічную міліцыю. Потым атрымаў прызначэнне ў намеснікі Навумава. Пасля скандалу з «домікамі ў вёсцы» у міліцэйскіх начальнікаў і адстаўкай Аляксандра Шчурко, заняў месца першага намесніка міністра. Адразу па адстаўцы Навумава Лукашэнка прызначыў Куляшова выконваючым абавязкі.

Куляшову 50 гадоў, ён нарадзіўся у гарадку Алі-Байрамлы (Азербайджан).

Такім чынам практыка прызначэння на галоўныя сілавыя пасады не ўраджэнцаў Беларусі працягваецца. Куляшоў скончыў мінскую школу міліцыі, а таксама Акадэмію МУС СССР. Перад генеральствам ён пабываў на пасадзе ў Гомелі.

Падчас знаходжання на пасадзе кіраўніка мінскай міліцыяй Анатоль Куляшоў неаднаразова кіраваў разгонам апазіцыйных акцый.

Менавіта Куляшоў пачынаў курыраваць расследаванне выбуху на дзень рэспублікі 4 ліпеня, але потым атрымаў павышэнне па службе.

**ЗП**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

Від аплаты — Дата — Сума

За газету "Наша Ніва"

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

Від аплаты — Дата — Сума

За газету "Наша Ніва"

КВІТАНЦЫЯ

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічваюць грошы на выхад газеты.

## Дзякуй

**Віктару В.** з Бабруйскага раёну.
**В.М.** з Брэста.
**Ірыне З.** з Смалявіцкага раёну.
**С.К.** з Гродна.
**Вользе П.**, **Бернарду П.**, **Андрэю А.** з Мінскага раёну.
**Аляксандру Б.** з Капыльскага раёна.
**Наталлі Л.** з Дзятлаўскім раёне.
**М.Б.** з Дубровенскага раёну.
**Мікалаю Р.** з Наваградскага раёну.
**В.Ц.** з Жлобінскага раёну.
**Міхаілу Т.** з Слуцкага раёну.
**Аляксандру П.** з Полацкага раёну.
**М.Х.**, **В.Б.** з Шчучынскага раёну.
**Уладзіміру Д.** з Барысаўскага раёну.

# «Мы можам сутыкнуцца з неплацежаздольнасцю ўраду»

**Працяг са старонкі 1.**

У прыватнасці, гаворка магла весціся пра ўсё пра той жа «Нафтан», «Гомельскі хімічны завод», «Гродна Азот», «Магілёўхімвалакно», а таксама даўняе пытанне продажу беларускіх малаказаводаў.

У прынцыпе, «КоммерсантЪ» не памыліўся, скандал такі ўсчаўся. Пакуль Лукашэнка і Пуцін абмяркоўвалі прыватна «праблемныя пытанні, якія існуюць у адносінах дзвюх краін», на авансцэну выйшаў міністр Кудрын.

«Беларусі пагражае банкруцтва», — адразу ж выпаліў журналістам старшыня расійскага Мінфіну.

«На наш погляд, урад Беларусі робіць недастатковыя захады, каб забяспечыць плацежаздольнасць сваёй эканомікі, — сказаў міністр, адказваючы на пытанне па выдачы нашай краіне апошняй траншы крэдыту. — Мы можам сутыкнуцца з неплацежаздольнасцю беларускага ўраду і наагул эканомікі, магчыма нават пры канцы гэтага году, а можа — праз год».

Кудрын лічыць, што ў Беларусі ідзе адцягванне крызісных з'яў штучным чынам, за кошт масіраванай крэдытнай падтрымкі, беларускае кіраўніцтва спрабуе кампенсаваць структурныя недахопы прамысловасці, каб падтрымліваць плацежны баланс і курс валюты на неабходным узроўні.

Паводле словаў расійскага міністра, беларускі ўрад быў пачаў пад уплывам Расіі і МВФ рэфармаваць эканоміку, але хутка іх зноў спыніў.

Што праўда, ужо па сканчэнні пасяджэння Саўміну Пуцін заявіў, што Расія працягне аказваць Беларусі фінансавую, у тым ліку крэдытную падтрымку. А заявы Кудрына назваў вельмі агульнымі. «Што б ні адбывалася ў сусветнай эканоміцы, калі спатрэбіцца Беларусі плячо, Расія заўсёды гэта зробіць», — сказаў У.Пуцін.

Ужо на наступны дзень Лукашэнка склікаў нараду па сацыяльна-эканамічных пытаннях. Па тоне размовы можна было здагадацца, наколькі паспяхова прайшлі перамовы з прадстаўнікамі Крамля. Лукашэнка відавочна быў не ў гуморы, ён персанальна папярэдзіў старшыню ўраду Сяргея Сідорскага і кіраўніка Нацбанку Пятра Пракаповіча, што скончыўся час кланяцца Расіі.

«Не выходзіць у Расіі — не трэба біць паклоны, ныць, плакаць, трэба шукаць сваё шчасце ў другой частцы планеты. Я гэта свядома публічна кажу», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

**Не паспелі яшчэ аціхнуць разборкі між Лукашэнкам і Кудрыным, як Беларусь запрасіла ў Расіі новы крэдыт у памеры 9 мільярдаў даляраў. На гэты раз для пабудовы АЭС.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Лукашэнка быў абураны заявамі Кудрына. «Мы ўчора назіралі цікавую сітуацыю, калі прэзідэнт Беларусі сядзеў з Пуціным і абсалютна на сяброўскай ноце абмяркоўваем пытанні. А ў гэты час Кудрын дае прэс-канферэнцыю сутнасць якой — пасеяць паніку ў Беларусі. Ён цалкам кансалідаваўся з нашымі адмарозкамі, якія тут на заходнія грошы вякаюць і пачынаюць вучыць працаваць», — зазначыў Аляксандр Рыгоравіч.

Лукашэнка заклікаў Сідорскага не вадзіць міністраў па звыклых дарожках, а ехаць прадаваць «лыжку цукру, дзе нас не ведаюць». «Чаго вы лезеце ў тую Расію, дзе вам выспяткі даюць? Няўжо вы не разумееце, што ўжо не першы раз стварaецца сітуацыя, калі нас хочуць узяць голенькімі і голымі рукамі, бясплатна? Бо ўчора Пуцін сказаў, што на падлёце да Мінска яны з Кудрыным абмеркавалі сітуацыю. І тут Кудрын разразіўся тырадай. Што, гэта было не ўзгоднена? Усё гэта ўзгоднена», — сказаў Лукашэнка.

Аляксей Кудрын таксама не стаў адмоўчвацца і адказаў на заявы кіраўніка Беларусі. Ён паведаміў, што выдача крэдыту ўсё яшчэ магчымая.

«Калі тыя, хто хоча дапамагаць Беларусі і хоча збалансаванай і стабільнай эканомікі, прыраўноўваюцца да апазіцыі, то я тады не разумею, што ж патрэбна Беларусі», — заявіў Кудрын на брыфінгу журналістам 1 чэрвеня.

Па яго меркаванні, сённяшняя сітуацыя «яшчэ больш ставіць пытанне пра тое, што такая падтрымка можа апынуцца безвыніковай і неэфектыўнай».

Прэм'ер Сяргей Сідорскі ўвогуле сказаў, што Кудрын разважае «на ўзроўні кладаўшчыка», у якога «ёсць ключы ад замка ад свірна і які далей кладоўкі нічога не бачыць». «Беларусь не праядае расійскія грошы, а ўкладвае іх у новую эфектыўную эканоміку», — зазначыў С.Сідорскі.

Зрэшты, не паспелі яшчэ аціхнуць гэтыя разборкі, як стала вядома, што Беларусь запрасіла ў Расіі новы крэдыт у памеры 9 мільярдаў даляраў. На гэты раз для пабудовы АЭС. А крыніца ў расійскім урадзе ў аўторак паведаміла, што спрэчка між Кудрыным і Лукашэнкам вычарпаная.

**Зміцер Панкавец**

# Ахоўнік прэзідэнта

Некалькі тыдняў таму Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб «Аб дзяржаўнай ахове», які ўраўнаважвае службу аховы прэзідэнта з КДБ.

Падрыхтоўкай і лабіраваннем займаўся кіраўнік Службы бяспекі прэзідэнта Андрэй Уцюрын. Паводле новага дакумента, ведамства Уцюрына атрымала законнае права праводзіць аператыўна-вышуковую дзейнасць і ствараць падраздзяленні спецыяльнага назначэння. Не апошняя заслуга ў стварэнні адной з наймацнейшых у свеце службаў аховы кіраўніка дзяржавы належыць менавіта Андрэю Уцюрыну.

Гэтага лысаватага крэпкага мужчыну можна часта ўбачыць побач з Аляксандрам Лукашэнкам. Уцюрын суправаджае Лукашэнку ў замежных камандзіроўках. Нярэдка ў кадры тэлевізійнікаў ён трапляў разам з будучым кіраўніком Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімірам Макеем. Падчас звароту галавы дзяржавы да народу і парламенту Уцюрын сядзеў побач з Віктарам Лукашэнкам.

Ураджэнца Пензы Андрэя Уцюрына часта называюць новым чалавекам у атачэнні кіраўніка дзяржавы. Насамрэч гэта не зусім так, хоць публічна ягонае прозвішча і прагучала толькі ў ліпені 2007, калі 36-гадовы падпалкоўнік замяніў Юрыя Жадобіна на пасадзе начальніка службы бяспекі прэзідэнта.

Тым не менш, побач з Лукашэнкам



Уцюрын з году Ганебнага рэферэндуму — з 1995-га, з 24 гадоў. Ці шмат хто з цяперашніх набліжаных да ўлады людзей могуць пахваліцца нечым падобным?

У 1992 годзе Андрэй Уцюрын скончыў Саратаўскае вышэйшае вайскова-каманднае вучылішча. А потым лёс закінуў яго ў Беларусь. У першыя гады незалежнасці ён займаў розныя пасады ў сістэме МУС Беларусі. Па некаторых звестках, служыў і ва ўручанскім спецназе 3214.

Зрэшты, гэта было толькі да той пары, пакуль на службу да сябе не паклікаў Лукашэнка. Можна толькі здагадвацца, якія ён там займаў пасады і які прайшоў шлях. Відавочна толькі, што ў такім раннім узросце Уцюрын прыйшоў не на кіроўныя пасады. Але калі Уцюрын змяняў Жадобіна, то ўжо з'яўляўся кіраўніком упраўлення асабістай аховы Лукашэнкі.

Уцюрын належыць да наймаладзейшага пакалення людзей, што знаходзяцца побач з Лукашэнкам. Старшыні памежнага камітэту Ігару Рачкоўскаму — 40, намесніку кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Мікалаю Снапкову — 40, Андрэю Уцюрыну — 38, першай намесніцы кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Наталлі Пяткевіч — 37, галоўнаму ідэолагу Усеваладу Янчэўскаму — 33, столькі ж і самому Віктару Лукашэнку. Столькі 30-гадовых побач з Лукашэнкам не было ніколі.

Разам з тым, Андрэй Уцюрын абсалютна не вылучаецца з агульнага шэрагу беларускіх сілавікоў, большасць з якіх нарадзіліся за межамі краіны. Раду бяспекі ўзначальвае ўраджэнец Днепрапятроўску Юры Жадобін, КДБ — яшчэ адзін сын афіцэра савецкай арміі ўраджэнец Украіны Вадзім Зайцаў. З Смаленшчыны былы міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў, а ягоны наступнік Анатоль Куляшоў нарадзіўся ў азербайджанскім Алі-Байрамлы. Дарэчы, адтуль жа і міністр па надзвычайных становішчах Энвер Барыеў. Асецін Юры Караеў узначальвае спецназ.

Уцюрын асабіста наведваў камеры турмы на Акрэсціна падчас падзеяў на Плошчы. Людзі, што нейкі час працавалі з ім, характарызуюць Уцюрына, як «разумнага і хітрага чалавека».

**Зміцер Панкавец**

IN MEMORIAM

## Аляксандр Патупа



На 65-м годзе жыцця памёр ганаровы старшыня Саюзу прадпрымальнікаў Аляксандр Патупа. Народжаны ў 1945 году ў Севастопалі, ён скончыў фізічны факультэт МДУ і размеркаваўся ў Беларусь. У часы перабудовы стварыў прыватную выдавецка-паліграфічную кампанію «Эрыдан», а яшчэ набыў вядомасць як футуролаг. Быў адным з творцаў незалежнага грамадства, стаяў у апазіцыі да Лукашэнкі. Але ў 2009 годзе, калі стваралася Кансультацыйная рада пры кіраўніку Адміністрацыі прэзідэнта, увайшоў у яе.

Пайшоў ён з жыцця нечакана для сяброў у шпіталі ў Бараўлянах.

«Аляксандр Патупа быў адважным і разнастайным чалавекам. Яму было шматлікае дадзена, і ён рэалізаваў гэта ў сваім жыцці. Ён не меў эканамічнай адукацыі, але ён у сваіх прагнозах быў дакладнейшы за ўсіх прафесіяналаў», — сказаў пра яго Леанід Міндлін.

# Дэвальвацыя: МВФ не настойвае, але...

Працяг са старонкі 1.

Што за складаныя патрабаванні выставіў МВФ, над якімі ўладам прыйшлося падумаць? Фонд традыцыйна захоўвае канфідэнцыйнасць.

Прадстаўнік МВФ у Беларусі адзначыла, што Фонд не настойвае на яшчэ адной дэвальвацыі беларускага рубля, а толькі «прапануе пэўную гнуткасць ва ўстанаўленні валютнага курсу». Гучыць, як завуаляванае тое самае.

Эканамічныя паказчыкі — рост дэфіцыту замежнагандлёвага балансу, падзенне золатавалютных рэзерваў — падказваюць, што рэсурсы для ўтрымання курсу рубля ў Беларусі вычэрпваюцца. Тое самае адчуваюць фінансісты і простыя людзі, адсюль і ажыятажны попыт на валюту ў канцы мая і на пачатку чэрвеня. Паніжэння курсу рубля хацела б прамысловае лобі.

Правакацыйныя заявы міністра фінансаў Расіі Аляксея Кудрына і адцяжка выдачы Расіяй чарговага крэдыту павялічылі негатыўныя чаканні.

Павысіліся шанцы, што зніжэнне курсу рубля адбудзецца раней, чым увосень. Ужо да 1 ліпеня валютны кошык можа апусціцца да закладзенага на цэлы год мінімуму. Рашэнне аб далейшай карэкціроўцы рамачнага кошыка будзе залежаць ад дынамікі плацёжнага балансу. У выпадку, калі за май золатавалютныя рэзервы краіны знізяцца больш чым на $500 млн, імавернасць падзення курсу рубля да 3000 за даляр стане амаль стопрацэнтавай.

Гэта, у сваю чаргу, павысіць цану імпартных тавараў, панізіць цэны нерухомасці і палепшыць фінансавую сітуацыю прадпрыемстваў, што працуюць пераважна на беларускай сыравіне.

**Мікола Бугай**

## «Опель» стане расійскай машынай

Расійскі дзяржаўны «Сбербанк» атрымае 35% акцый кампаніі «Опель». Гэткае рашэнне ўхваліў нямецкі ўрад. Цяперашні ўладальнік «Опеля», канцэрн «Джэнерал мотарз», распачаў працэдуру банкруцтва, пры гэтым ён распрадае свае структурныя адзяленні ў іншых краінах. «Сбербанк» выступае ў адной супольцы з канадскім вытворцам запчастак, кампаніяй «Магна». Для Расіі атрыманне кантролю над сучаснай заходняй кампаніяй — справа нацыянальнага прэстыжу. Але таксама гэта і магчымасць перанесці на расійскія заводы сучасныя тэхналогіі вытворчасці і маркетынгу.

Расійскія «Опелі» будуць выпускацца на базе заводу ГАЗ у Ніжнім Ноўгарадзе, які належыць алігарху Дзерыпаску. Менавіта ён мае цесныя сувязі з «Магнай».

**МБ**



**Opel**

**Пры жыцці заснавальніка фірмы Opel, нямецкага канструктара Адама Опеля, на яго фабрыках не было выраблена ніводнай машыны. Адам Опель у 1862 адкрыў фабрыку па вытворчасці швейных машын, у 1886 — вытворчасць экіпажных колаў, а яшчэ праз год яго прадпрыемства пачало рабіць ровары. Так нарадзілася фірма Adam Opel AG.**

**Пасля смерці Адама Опеля фірма перайшла да яго пяці дзяцей. А ў 1898 былі сабраныя першыя аўтамабілі «Опель–Лутцман». Іх хуткасць не перавышала 20 км/г. Але да 1913 Opel стаў найбуйным вытворцам аўтамабіляў у Нямеччыне.**

**У часы нацызму Opel эксплуатаваў працу вязняў канцлагераў.**

**Сёння Adam Opel AG — самы буйны філіял General Motors за межамі ЗША. На заводах фірмы працуе 55 тыс. чалавек.**

**Аб'ём продажаў Opel у Еўропе ў 2008 склаў 1 459 000 аўтамабіляў, на 10,5% менш, чым у 2007. У мадэльны шэраг уваходзяць Corsa, Tigra, Astra, Vectra, Calibra, Omega... А таксама пазадарожнікі Frontera і Monterey, ды новы мінівэн Cintra.**

**У Беларусі новая машына Опель каштуе ад 11700 еўра за Corsa аб'ёмам 1.2 да 27000 еўра за Insignia 2.0 з усімі наваротамі.**

## «Дзе грошы?»

Нацбанк пераконвае беларусаў, што праблем з валютай у краіне няма, і замежныя грошы ў банках будуць заўсёды. Тым не менш, на працягу апошняга тыдня мінчане перыядычна сутыкаліся з таблічкамі «Валюты няма» ў абменніках.

У аддзяленнях банкаў, якія знаходзяцца далёка ад цэнтру сталіцы — у спальных раёнах, — праблем з валютай цяпер сапраўды няма. У адным прапануюць купіць каля 4 тысяч даляраў, прыблізна такая ж сума ёсць і ў еўра. У другім валюты трохі меней — 2-3 тысячы даляраў.

У цэнтры ж праблем паменела, але перыядычна ўзнікаюць. «Літаральна адразу, як адкрыліся, купілі дзве тысячы даляраў, — апраўдвалася касірка, — засталася толькі дробязь». У іншым абменніку пра недахоп валюты нават не ўзгадваюць: «Больш за тысячу ёсць, купляеце?»

Далярам беларусы пакуль давяраюць больш, таму і разбіраюць хутчэй за еўра. Увечары амерыканскай валюты застаецца няшмат, а еўрапейская ляжыць амаль некранутай. Прыблізны запас валюты для сярэднестатыстычнага абменніку АСБ «Беларусбанк» складае 2000 даляраў, 500 еўра і 5000 расійскіх рублёў.

**Ягор Марціновіч**

### Еўра перайшоў псіхалагічную мяжу 4000 рублёў

**Нягледзячы на тое, што Нацбанк усталяваў афіцыйны курс еўра на выходныя ў памеры 3895,61 рублёў, ужо ў суботу АСБ «Беларусбанк» прадаваў еўра па 4000 рублёў.**

## СЦІСЛА

### З 2011 году беларуская мытня з'яднаецца з расійскай

З 1 ліпеня 2011 году будзе дзейнічаць адзіная мытная тэрыторыя Беларусі, Казахстану, Расіі. Дамова пра гэта дасягнутая ў Мінску на 5-м пасяджэнні Камісіі мытнага саюзу, паведаміў першы намеснік старшыні ўраду Расіі Ігар Шувалаў.

### Падаткі змяніць не паспелі

Змяненне стаўкі ПДВ з 1 чэрвеня малаімавернае. Такое меркаванне выказаў першы намеснік міністра па падатках і зборах Уладзімір Палуян. «Практычна рэалізаваць палажэнне праекту ўказу з 1 чэрвеня цяжка», — сказаў Палуян, падкрэсліўшы, што «задній датай уводзіць змяненні ў ПДВ немагчыма».

### Бярозаўская ДРЭС спыніла экспарт у Польшчу

Гэтую інфармацыю пацвердзіў начальнік вытворча-тэхнічнага аддзелу ДРЭС Андрэй Чыбук. ДРЭС штомесячна пастаўляла заходнім суседзям 70 млн кілават-гадзін, але крызіс зменшыў попыт.

### На шырокай каляіне да Вены

Расія, Украіна, Славаччына і Аўстрыя распрацоўваюць праект пабудовы чыгункі на шырокай каляіне да сталіцы Аўстрыі. Гэта мае павялічыць транзіт грузаў з ЕС у Расію. На сёння такая чыгунка даходзіць толькі да славацкага гораду Кошыцэ.

### Беларускі экспарт зменшыўся ўдвая

Нацыянальны статыстычны камітэт падсумаваў баланс гандлю таварамі Беларусі за першыя месяцы году. За студзень-красавік аб'ём экспарту склаў 5,6 мільярдаў даляраў. Гэта 51,4% ад таго, што было год таму. Тады за такі ж перыяд прадалі тавару на $10,8 мільярдаў. Імпарт таксама зменшыўся. Ён роўны $8,2 мільярдаў, 61% ад леташняга паказальніку.

Адмоўнае сальда замежнага гандлю таварамі вырасла за красавік на $759,2 млн. За 4 месяцы яно склала $2621,7 млн. За першыя 4 месяцы 2008 году яно складала $1376,8 млн.

Вынікі гандлю паслугамі за красавік будуць злічаныя пазней.

Рост адмоўнага сальда вымагае змены эканамічнае палітыкі. Або прыйдзецца адміністрацыйна спыняць імпарт (тады краіна, імаверна, не атрымае наступных траншаў ад МВФ), або патрэбная далейшая дэвальвацыя рубля.

Аляксандар Лукашэнка выказаўся ў мяккай форме за першае: трэба акуратна абмежаваць імпарт, «але так, каб не сапсаваць людзям настрой». Гэта значыць, не надта тое афішуючы.

**ЯМ; МБ; ІТАР-ТАСС, БелаПАН**

# Дзесяць пытанняў і адказаў пра «Усходняе партнёрства»

7 траўня ў Празе афіцыйна стартавала праграма Еўрапейскага Саюзу «Усходняе партнёрства». На саміт у сталіцу Чэхіі прыехалі прэзідэнты і міністры дваццаці сямі краінаў — чальцоў ЕС і шасці постсавецкіх рэспублік, прынятых у новую еўрапейскую ініцыятыву. Абмяркоўвалі, як могуць зблізіцца пакуль такія далёкія — і палітычна, і эканамічна — краіны. З дапамогай еўрапейскіх чыноўнікаў і самых сур'ёзных дакументаў мы пашукалі простых адказаў на пытанні, якія часцей за ўсё задаюць пра новую ініцыятыву.

**1. Якія краіны ўваходзяць ва «Усходняе партнёрства»?**

Арменія, Азербайджан, Беларусь, Грузія, Малдова, Украіна.

**2. Чаму Еўрапейскі Саюз выступіў з гэтай ініцыятывай?**

Паспяховае пашырэнне Еўрасаюзу зрабіла гэтыя краіны бліжэйшымі да ЕС, а іх бяспека, стабільнасць і дабрабыт пачалі моцна ўплываць на Еўропу. Гэтыя краіны ў рознай ступені ажыццяўляюць палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя рэформы і выказалі жаданне стаць бліжэйшымі да Еўрапейскага Саюзу.

Разам з «Усходнім партнёрствам» ЕС прапануе сканцэнтравацца на перспектывах па падтрымцы дэмакратычных і рынкава арыентаваных рэформаў і такім чынам спрыяць іх палітычнай і эканамічнай стабільнасці.

**3. Прапанова агульная для ўсіх краінаў ці залежыць ад дамоўленасці з ЕС?**

«Усходняе партнёрства» прапануе і двухбаковыя, і шматбаковая меры па пашырэнні супрацоўніцтва. Існуюць разнастайныя ступені развіцця двухбаковых стасункаў. З Украінай і Малдовай, да прыкладу, у Еўрасаюзу стасункі нашмат больш шчыльныя. Таму ў ЕС будзе індывідуальны падыход да кожнай краіны. Тое, як далёка ЕС пойдзе ў стасунках з кожнай краінай, будзе залежаць ад прагрэсу партнёраў у рэформах.

**4. Якія галоўныя пункты праграмы «Усходняе партнёрства»?**

«Партнёрства» ўключае гандлёвыя пагадненні, праграмы па паляпшэнні адміністрацыйных функцый краінаў, вывучэнні магчымасцяў адкрыцця рынкаў для свабоднага перамяшчэння працоўных, павелічэнні энергетычнай бяспекі, пашырэнні супрацоўніцтва ў сферы аховы навакольнага асяроддзя.

**5. Як будзе фінансавацца праграма «Усходняе партнёрства»?**

Агульная падтрымка для шасці краінаў будзе павялічвацца ад 450 млн еўра ў 2008 да 785 млн еўра ў 2013 г. Гэта рост прыкладна на 75%. Гэта значыць, дадатковыя 350 млн еўра для планавых мэтаў на перыяд з 2010 да 2013 г. Апроч таго, ЕС перанакіруе 250 млн еўра, ужо патрачаныя на рэгіянальныя праграмы ў рамках рэалізацыі праграмы «Усходняе партнёрства».

**6. Ці набліжае ўдзел ва «Усходнім партнёрстве» перспектывы далучэння да Еўрасаюзу?**

Удзел у «Партнёрстве» не азначае абавязковага ўключэння ў ЕС. Усё будзе залежаць ад натуральнага развіцця двухбаковых стасункаў.

**7. Ці магчымае скасаванне візаў для жыхароў краінаў-удзельніцаў «Усходняга партнёрства»?**

Наўрад ці гэта будзе хутка, бо спрошчанае перамяшчэнне жыхароў і скасаванне візаў паміж ЕС і шасцю краінамі «Усходняга партнёрства» залежыць ад выканання часам тэхнічна складаных мераў, такіх, як паляпшэнне памежнага кіравання, аб'ядналае кантраляванне мігрантаў. Таму для гэтага спатрэбіцца некаторы час. Але Еўрасаюз спрабуе ісці да гэтага паступова.

**8. Ці можа быць уведзена еўра ў краінах «Усходняга партнёрства»?**

Тэарэтычна гэта магчыма, але можа быць вельмі доўгай перспектывай. Большасць краінаў, што ўвайшлі ў Еўрасаюз падчас апошняга пашырэння, не ўваходзяць у еўразону.

**9. Ці будзе ў жыхароў шасці краінаў-удзельніцаў «Усходняга партнёрства» магчымасць звяртацца ў Еўрапейскі трыбунал справядлівасці?**

Еўрапейскі трыбунал справядлівасці — гэта найвышэйшая судовая ўстанова Еўрасаюзу, гэта інстытут Еўрапейскага Саюзу. Ён наўпрост суадносіцца з законамі ЕС. Партнёрскія краіны з Усходняй Еўропы не падлягаюць юрысдыкцыі ЕС. Таму суб'екты, што сюды не ўваходзяць, не могуць звяртацца ў Еўрапейскі трыбунал.

Але ёсць Еўрапейскі суд па правах чалавека ў Страсбургу, які з'яўляецца часткай Еўрапейскага Саюзу. І жыхары краінаў–удзельніцаў, калі яны не задаволеныя рашэннем нацыянальнага суду, могуць звярнуцца ў Еўрапейскі суд па правах чалавека.

**10. Колькі будзе дзейнічаць «Усходняе партнёрства»?**

Пакуль фінансаванне «Усходняга партнёрства» разлічанае да 2013 г. Аднак гэта не значыць, што па заканчэнні гэтага тэрміну праграма перастане існаваць. Цягам яе рэалізацыі будзе бачна, ці трэба яшчэ штосьці паляпшаць, што рабіць хутчэй, што не так важна і г.д. Таму пакуль вызначаны такі тэрмін.

# ...І тады Крэмль проста размажа па сцэнцы

Візіт Пуціна 28 мая, эпатажныя заявы міністра фінансаў Расіі Кудрына і нарада ў Лукашэнкі пасля яго высвецілі некалькі рэчаў.

Па-першае, афіцыйны кіраўнік упершыню так выразна, адкрытым тэкстам прызнаў, што незалежнасць краіны ў небяспецы.

«Гульня распачатая не на жарт, майце на ўвазе. Выстаім — будзе дзяржава. Не выстаім — зламаюць і бясплатна ў кішэнь пакладуць, будзем бегаць потым ды паглядаць налева і направа, каб нам кавалак хлеба са стала кінулі». Ясней не скажаш.

Між тым ужо некалькі гадоў гучаў рэфрэн, што Беларусь адбылася як суверэнная дзяржава. Або гэта было моцнай гіпербалай, або зараз Масква адкінула ўсе цырымоніі і ўзяла за гарляк чыста канкрэтна. А можа, і тое, і другое.

Ва ўсякім разе, ёсць моцныя падставы меркаваць, што за кулісамі «саюзнага саўміну» ішла душылаўка ў пытаннях беларускіх актываў, а таксама, каб прызналі Абхазію ды Паўднёвую Асецію.

Гэта прарвалася назаўтра ў эмацыйных пасажах Лукашэнкі. «Няўжо вы не разумееце, што ўжо не першы раз ствараецца сітуацыя, калі нас хочуць узяць голенькімі і голымі рукамі, бясплатна?» — рытарычна спытаўся афіцыйны кіраўнік у атачэння. Што ж да прызнання каўказскіх рэспублік, то ён раздражнёна заўважыў: «Гэта, урэшце, не расійскае пытанне». Г газета прэзідэнцкай адміністрацыі, каментуючы Кудрына, зазначае: «...Найхутчэй, што міністр паставіў эканамічныя ўзаемадачыненні ў прамую залежнасць ад экстраннага прызнання Мінскам дзяржаўнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі».

Па-другое, мінскі раўнд высвятлення стасункаў між заклятымі хаўруснікамі яскрава праілюстраваў, нашто Лукашэнку спатрэбілася Еўропа.

Нармалізацыя дачыненняў з Еўропай — паратунак ад маскоўскага ціску. Іначай Крэмль проста размажа па сцэнцы.

Трэцяя выснова: беларускія фінансы сапраўды вось-вось могуць заспяваць рамансы. Рубель ледзьве ліпіць. Таму пасажы расійскага віцэ-прэм'ера пра хуткую неплацежаздольнасць Беларусі



выклікалі такі гнеў. «Арыя госця» стала ўдарам пад дыхаўку. Народ жа адразу ламануўся ў абменнікі...

Цяпер тутэйшыя дзяржаўныя СМІ чыхвосцяць як Кудрына ў амплуа Касандры, так і, канечне ж, апазіцыю, якая нібыта скача ад радасці ў прадчуванні дэфолту Бацькаўшчыны. Маўляў, якія ж вы патрыёты! Кранае, што ментарамі незалежніцтва становяцца тыя, хто не так даўно заклікаў зліцца з Расіяй ў экстазе «братняй інтэграцыі».

Але тады якога ражна працягваеце малаціць у сваіх друкаваных органах развароты на тэму «саюзнага будаўніцтва»? Што будуеце? Маўзалей для беларускай незалежнасці?

Фальшывыя словы, як і раней, мутнай плынню льюцца з высокіх трыбун і рэфрэнам гучаць з уладных рупараў. Беларусь будзе пад пагрозай як мінімум пакуль не скончыцца эпоха Вялікай Хлусні.

Гэта не проста метафары. Так, хлусня ў выглядзе нагонкі ВУП любым коштам — праклён савецкай планавай гаспадаркі — проста руйнуе зараз айчынную эканоміку. Сістэма працягвае тупа заганяць сама сябе ў пастку.

Эканаміст Алена Ракава па выніках візіту маскоўскай каманды зазначае: «Цяжка сказаць, чаго ў расійскай пазіцыі болей — грубага шантажу ці тонкага разліку. Аднак, праводзячы цяперашнюю эканамічную палітыку, то бок не спыняючы прадпрыемствы, не скарачаючы бюджэт, бясконца пазычаючы грошы, адсоўваючы балючыя рэформы, урад робіць усё дзеля паскарэння страты Беларуссю сваёй эканамічнай самастойнасці».

Што тады застанецца ад самастойнасці палітычнай, вожыку зразумела.

**Аляксандр Класкоўскі**

# Алена Макоўская

## і прывадныя рамяні партыі

**Старшыня Вялікай Рады «Бацькаўшчыны» пра сітуацыю вакол стварэння арганізацыі «Беларускі дом».**



Працягваецца стварэнне арганізацыі «Беларускі дом», што задумаў былы кандыдат на пасаду прэзідэнта і палітвязень Аляксандр Казулін. Паэт Уладзімір Някляеў у нядаўнім інтэрв'ю «Народнай волі» назваў сярод сузаснавальнікаў «Беларускага дому» і Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына».

На гэта адрэагавала намесніца старшыні «Бацькаўшчыны» і былая прэс-сакратарка Казуліна Ніна Шыдлоўская. У звароце яна зазначыла, што арганізацыя не далучылася да ініцыятывы Казуліна і прынцыпова не ўмешваецца ў палітыку.

У сваю чаргу кіраўнік «Бацькаўшчыны», вядомы мастак Аляксей Марачкін, заявіў, што гэтыя словы былі прыватнай ініцыятывай спадарыні Шыдлоўскай, а не пазіцыяй арганізацыі. На яго думку, Шыдлоўская кіравалася жаданнем знайсці ў Мінску памяшканне для з'езду. Сам Марачкін рашуча падтрымлівае Аляксандра Казуліна.

З мэтай праяснення сітуацыі мы задалі некалькі пытанняў старшыні Вялікай Рады «Бацькаўшчыны» Алене Макоўскай.

**«Наша Ніва»: Казулін насамрэч выходзіў на «Бацькаўшчыну» з прапановай далучыцца да «Беларускага дому»?**

**Алена Макоўская:** Так, гэта было недзе ў пачатку году. Прапановаў далучыцца да арганізацыі пад умоўнай назвай — Асацыяцыя творчых саюзаў. Яна пазней трансфармавалася ў «Беларускі дом». Афіцыйнага ліста ў наш бок не паступала, ідэі былі агучаныя ў размовах і праекце камунікату, які рэкамендавалася падпісаць.

**«НН»: Рада «Бацькаўшчыны» разглядала гэтае пытанне?**

**АМ:** Так, ажно 2 сакавіка. Паколькі асноўным пытаннем з'яўлялася падрыхтоўка і правядзенне з'езду, пытанне аб падтрымцы ці ўваходзе ў казулінскую арганізацыю было разгледжана ў «розным». Рашэнне Рады магу працытаваць: «У сувязі са сканчэннем паўнамоцтваў дзейснай Малой Рады, у выпадку актуальнасці вярнуцца да разгляду пытання аб стварэнні грамадскай арганізацыі «Беларускі дом» пасля правядзення чарговага з'езду беларусаў свету».

**«НН»: Заявы Ніны Шыдлоўскай — гэта не прыватная ініцыятыва ці ўзважаная пазіцыя арганізацыі?**

**АМ:** У каментары Ніны прысутнічаюць асабістыя ацэнкі ў адносінах да самога палітыка. Паколькі яна працавала з ім, то, напэўна, мае на гэта права. Але тое, што датычыцца яе каментару ў агульным, у ім прагучала пазіцыя самой «Бацькаўшчыны». І гэтую пазіцыю я б хацела яшчэ раз прадэманстраваць.

«Бацькаўшчына» не з'яўляецца палітычнай арганізацыяй. Сябры Згуртавання — людзі абсалютна розных палітычных поглядаў. Мы з павагай ставімся да іх меркаванняў. І не нам вырашаць, каго з палітыкаў ім падтрымліваць. З часоў заснавання «Бацькаўшчыны» кіраўніцтву арганізацыі забаранялася быць сябрам якой-небудзь партыі. Мы можам супрацоўнічаць і супрацоўнічаем з палітычнымі структурамі ў Беларусі па тых напрамках, што адпавядаюць нашаму статуту.

Непрыемна ўразіў факт, што імя Згуртавання стала называцца ў прэсе ў сувязі з гэтай ініцыятывай, прычым сябрамі Рады, якія на гэтай жа радзе і прысутнічалі.

**«НН»: Заявы Марачкіна не могуць прывесці да нейкага расколу ўнутры арганізацыі?**

**АМ:** «Бацькаўшчына» звычайна вырашала складаныя сітуацыі дзякуючы кансалідаванасці яе сяброў, узважанай пазіцыі кіраўніцтва. Беларуская дыяспара і так падзеленая геаграфічна, пакаленнямі, палітычнымі поглядамі. І наша задача сёння такая ж, як і раней, — аб'ядноўваць, а не ўкідваць яшчэ адзін яблык разладу. З свайго боку я хачу выказаць шчырае спадзяванне, што Аляксей Марачкін больш увагі будзе надаваць менавіта з'езду і яго падрыхтоўцы, чым нейкім новым ініцыятывам.

**«НН»: Вашу арганізацыю хочуць уцягнуць у палітычныя гульні?**

**АМ:** Гэта хутчэй выкарыстоўванне яе ў палітычных мэтах. Я шчыра спадзяюся, што той, хто ініцыяваў гэты працэс, не прадбачыў, да чаго ён можа прывесці ў выніку. Тут хутчэй прагладаюцца метады часоў КПСС — «прывадныя рамяні партыі», і, на жаль, некаторыя дзеячы інтэлігенцыі ідуць на гэтую ролю. Але лёгкім узмахам рукі немагчыма пабудаваць дом. Так не бывае. Без «будзённай і шэрай працы» не бывае нічога.

**«НН»: Як цяпер справы з памяшканнем для з'езду, ці ўдалося нешта знайсці?**

**АМ:** Мы атрымалі паведамленне ад Міністэрства культуры Беларусі, што, на жаль, тэатр Янкі Купалы спыняецца на рэстаўрацыю. Такім чынам, чакаем толькі адказу з Мінгарвыканкаму. Калі яго не будзе на гэтым тыдні, правядзенне з'езду ў Мінску зрываецца. Мы проста не паспеем правесці ўсю арганізацыйную працу.

Дакладна праз падобную сітуацыю праходзіла «Бацькаўшчына» напярэдадні практычна ўсіх мінулых з'ездаў. І тлумачыцца яна зусім не фігурай вядомага палітыка, які да «Бацькаўшчыны» не мае ніякага дачынення, а агульным стаўленнем беларускіх уладаў да любых незалежных ініцыятываў.

Каб даведацца, як ідуць справы па стварэнні «Беларускага дому», мы патэлефанавалі Аляксандру Казуліну. «Працуем, жыццё пакажа, што будзе далей», — зазначыў палітык.

**Зміцер Панкавец**

## ЦЫТАТЫ

### Глеб пашые сыну сцяг

«Пашыю яму дома [сцяг]. Бо я прызнаю толькі бел-чырвона-белы сцяг... Чаго тут баяцца?»

Павел Рыгоравіч Глеб, бацька Аляксандра Глеба, у інтэрв'ю «Народнай волі» пасля перамогі іспанскай «Барселоны» над «Манчэстэр Юнайтэд» у фінале Лігі чэмпіёнаў па футболе. Упершыню ў гісторыі пераможцам Лігі чэмпіёнаў стаў і беларускі футбаліст.



### Гісторыя адной дэградацыі

«У 1965 годзе паказчыкі самагубстваў (на 100 000 нас.) у РСФСР, УССР і БССР адпаведна былі 21.3, 15.0 і 13.4, а забойстваў — адпаведна 5.8, 3.0 і 3.2. Праз 40 гадоў, у 2005 годзе, гэтыя ж паказчыкі па трох краінах былі наступныя: па самагубствах — 32.2, 22.5 і 30.8, а па забойствах — 24.9, 9,6 і 8.8».

Кандыдат сацыялагічных навук Сяргей Кандрычын у часопісе «Arche».



INTEX-PRESS



INTEX-PRESS

**Выпускнікі і выпускніцы: цяпер мы дарослыя! А дарослы сцаць кожны разумее ў сілу сваіх стэрэатыпаў. Фота з Баранавіч.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Ліга Еўропы прыедзе ў Наваполацк

Кубак Беларусі па футболе паехаў сёлета ў Наваполацк. У фінальным матчы за трафей «Нафтан» у дадатковы час зламаў супраціў салігорскага «Шахцёра» — 2:1.

Лік у першым тайме прыгожым ударам адкрыў вядомы бамбардзір Валеры Стрыпейкіс. У другім тайме салігорцы пайшлі наперад, і за дзве хвіліны да канца матчу Сяргей Кавальчук ударам з-за межаў штрафной лік зраўняў.

Здавалася, што цяпер псіхалагічная перавага будзе на баку «гарнякоў». Дзе там, у першым дадатковым тайме абаронца зборнай Дзмітры Верхаўцоў прынёс «Нафтану» перамогу.

Навапалачане шчыра падзякавалі за падтрымку сваіх фанатаў, якіх прыехала ў Мінск блізу дзесяці аўтобусаў. Уручэнне Кубку нагадала міні-Лігу чэмпіёнаў. «Нафтан» упершыню ў гісторыі стаў уладальнікам Кубку Беларусі.

Апроч трафею, наваполацкі клуб завяваў пуцёўку ў Лігу Еўропы.

**ЗП**

# Радзівілы ў Нясвіжы

Беларусь наведалі нашчадкі Радзівілаў. Дзесяць спадкаемцаў прабылі ў нашай краіне тры дні, аб'ехалі Мінск, Мір, Паланечку, Ішкалдзь і іншыя мясціны, звязаныя з іх продкамі.

Але галоўным пунктам сямейнага візіту стаў, безумоўна, Нясвіж. Тут задумляў унію з Швецыяй Януш, тут маліўся Альбрыхт, тут дзівакаваў Пане Каханку. Тут правяла дзяцінства і пані Альжбета Радзівіл, дачка апошняга гаспадара Нясвіжскага замку. Найстарэйшай з роду сёння 91 год, але яна да дробязяў памятае, як выглядаў Нясвіж за часамі яе дзяцінства.

Колішніх гаспадароў урачыста сустрэлі гаспадары сённяшнія. Старшыня Нясвіжскага гарвыканкаму падараваў гасцям бутэльку «Радзівілаўскага» шампанскага і вялікую рыбіну. Вазілі Радзівілаў па месце дзіцячым цягнічком з выявамі Мікі-Мауса на вагончыках. Для пані Альжбеты падрыхтавалі карэту, аднак высветлілася, што княгіня баіцца коней, таму перавагу яна аддала мерсэдэсу.

Вялізнае белае аўто прадставіў на час візіту Радзівілаў беларускі бізнэсовец. У Нясвіж княгіня ехала з мігралкай, машыны на трасе саступалі дарогу, а ДАІ салютавала.

Сёння Нясвіжскі палац — ужо не «міжкалгасздраўніца», якой быў за савецкім часам, але яшчэ і не гняздо найбагацейшага і найслаўнейшага роду на нашых землях. Планавалася, што для княгіні правядуць экскурсію ў гатовым крыле замку. Але яна рашуча накіравалася ў самую гушчэчу рэстаўрацыйных працаў. «Тут была брукаванка», «гэтая тэраса была іншай формы», — раз за разам чуў ад яе навуковы кіраўнік праекту рэстаўрацыі замку Сяргей Друшчыц. Той горача бараніўся, даводзячы, што замак аднаўляецца паводле архіўных дакументаў, а княгіня не ўсё памятае, бо была малая. Але ў нечым яны і пагаджаліся. Пабачыўшы аднаўленую пасля пажару вежу, пані Альжбета сказала, што яна не пасуе да агульнага віду.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

— Тут я з вамі згодны, — адказаў рэстаўратар.

— Дык у чым тады справа?

— Я за гэта не адказваю.

— А хто адказвае?

— Той, хто плаціць грошы.

— А хто плаціць грошы?

Рэстаўратар прамаўчаў.

Радзівілы прабылі ў замку больш за дзве гадзіны. Гэта быў першы такі маштабны іх візіт на радзіму.

**Тэкст і фота Юліі Дарашкевіч**

# Сутнасць чалавека

**Часам, калі чуеш — яшчэ адзін «стаў вязнем сумлення» — узнікае пачуццё безнадзейнасці. Калі чытаеш біяграфіі вязняў, чытаеш іх выказванні, узнікаюць зусім іншыя пачуцці.**

Кніга «Адзін дзень палітвязня» — 15-я ў серыі «Бібліятэка Свабоды. XXI стагоддзе». Цяжка ацэньваць поспех кніг, калі іх нельга купіць у звычайнай краме. Выдавецкі праект нон-профітнай арганізацыі, якой ёсць радыё «Свабода», не можа быць камерцыйным па вызначэнні. Але ўскосна пра поспех сведчыць увага да выхаду кнігі з боку незалежнай прэсы. Праўда, увага можа дыктавацца як зместам кнігі, так і кан'юнктурай часу, што, безумоўна, таксама істотна.

Думаецца, незалежна ад кан'юнктуры, кнізе «Адзін дзень палітвязня», наканавана застацца надоўга.

Сярод герояў дакументальнага зборніку Ганны Соўсь — вядомыя апазіцыянеры «са стажам» Юры Хадыка, Вячаслаў Сіўчык, Віктар Івашкевіч, Мікола Статкевіч, былыя міністры Васіль Лявонаў і Міхаіл Марыніч, экс-прэм'ер Міхаіл Чыгір, экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін, былыя дэпутаты Вярхоўнай Рады Андрэй Клімаў і Уладзімір Кудзінаў, прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч, а таксама вядомыя журналісты, праваабаронцы і нават адзін старшыня калгасу, Герой сацыялістычнай працы...

Вадзіму Лабковічу было ўсяго шаснаццаць, калі за палітычнае графіці ён быў асуджаны як злосны хуліган разам з Аляксеем Шыдлоўскім (старэйшым на тры гады) і правёў у зняволенні амаль шэсць месяцаў жыцця. У гутарцы з журналістам радыё «Свабода» Лабковіч успамінае, што ў Жодзінскай турме яго «...уразіла, колькі хлопцаў патрапіла за краты за драбязу. Адны ўзялі калгасны трактар, праехаліся за вёску і паставілі на месца. Нехта ўбачыў і даклаў. Усё, крадзеж трактару. Некалькі гадоў свеціць. На другога дзядзьку сусед напісаў, што той скраў ягоную бензапілу. Пілу не знайшлі, а дзядзьку ўжо арыштавалі».

Вам гэта нічога не нагадвае? Перачытайце «Архіпелаг ГУЛАГ» Аляксандра Салжаніцына і ўспомніце, колькі людзей сядзела ў сталінскіх лагерах таксама за драбязу: за каласкі, за анекдот, за тое, што хлопчык, сікаючы, вывеў на снезе слова Сталін. (Таксама свайго роду палітычнае графіці).

«Адзін дзень палітзняволенага» невыпадкова параўноўваюць са славутым салжаніцынскім апавяданнем «Адзін дзень Івана Дзянісавіча». Паралелі тут відавочныя.

Між тым, іншы вядомы пісьменнік, Варлам Шаламаў, які таксама быў вязнем ГУЛАГу, крытыкаваў гэтае апавяданне, надрукаванае на пачатку 1960-х. Што за фантастычны лагер апісвае Салжаніцын, здзіўляўся Шаламаў. «Каля санчасткі ходзіць кот — неверагодна для сапраўднага лагеру — ката даўно б з'елі». Аднак, Іван Дзянісавіч, у абліччы якога лёгка ўгадваецца сам Салжаніцын — герой літаратурнага твору, прыдуманы мастацкі вобраз.

Кніга Ганны Соўсь — цалкам дакументальная. Большасць з сарака аднаго героя кнігі, на шчасце, жывыя. Але сведчанні іх, сабраныя разам, для нас ужо цяпер неацэнныя.

Вось яшчэ адно сведчанне з яе. Іван Крук, 1944 году нараджэння, скончыў школу міліцыі, трыццаць гадоў працаваў у пракуратуры. Цяпер на пенсіі, займаецца праваабарончай дзейнасцю. Падчас мінулай прэзідэнцкай кампаніі збіраў подпісы за Мілінкевіча і Казуліна. Летам 2006 г. быў асуджаны за «супраціў міліцыі» — падчасператрусу ў яго доме зламаў уласны камп'ютэр. Амаль паўгоду адбываў пакаранне ў калоніі строгага рэжыму.

У гутарцы з журналістам Іван Крук успамінае: «Калі па мяне прыехалі дахаты супрацоўнікі міліцыі, я папрасіў іх, каб яны мяне не забіралі. Я даў слова афіцэра, што раніцай роўна а 9-й гадзіне буду ў міліцыі. Яны патэлефанавалі начальству і пакінулі мяне дома. Потым, калі я праходзіў усе турэмныя этапы, то на кожным з іх сустракаў розных людзей, таксама і добрых. І зразумеў, што чалавекам можна заставацца паўсюль, і дзеля гэтага шмат не трэба».

Часам, калі слухаеш зводку навінаў і чуеш, што яшчэ адзін «стаў вязнем сумлення», яшчэ аднаго кінулі за краты або выправілі на «хімію», узнікае пачуццё безнадзейнасці. Калі чытаеш біяграфіі вязняў, чытаеш іх выказванні, узнікаюць зусім іншыя пачуцці...

Той самы Шаламаў некалі пісаў у «Калымскіх апавяданнях»: «У лагерным досведзе негатыўнае ўсё, да апошняй хвіліны. Чалавек робіцца толькі горшым. І інакш быць не можа. У лагеры шмат таго, пра што чалавек не павінен ведаць. Але ўбачыць дно жыцця — гэта не самае страшнае. Самае страшнае, калі гэтае дно становіцца сутнасцю чалавека, калі мера яго маральнасці пазычаная ў крымінальнікаў».

Сутнасць сістэмы, «пазычанай ў крымінальнікаў», якая ўвесь час маральна выпрабоўвае чалавека на злом, не змянілася.

І ўсё-такі, пакуль ёсць людзі, якія сталі героямі зборніку «Адзін дзень палітвязня», застаецца надзея. Хацелася б верыць, што праз наступныя пятнаццаць гадоў перавыданне кнігі не спатрэбіцца.

**В.Травень**

# Адкрыты ліст міністру абароны Леаніду Мальцаву

Ад грамадзяніна Беларусі
**Уладзіміра Падгола.**

Спадар міністр!

Дзейнасць некаторых Вашых падначаленых прымусіла мяне звярнуцца да вас, каб Вы выправілі хібы ў працы Вашых афіцэраў.

Нядаўна СМІ паведамілі, што некаторыя вайскоўцы, якія выпісваюць газету «Наша Ніва», не могуць яе атрымаць, бо нейкія зладзеі крадуць гэтую газету з пошты.

Выказваліся версіі, што газету выцягваюць цэнзары-афіцэры ад таго, што газета няправільная.

І тое, і другое недапушчальнае ў арміі дзяржавы, якая пад кіраўніцтвам прэзідэнта рушыла ў Еўропу шляхам «Усходняга партнёрства».

Мушу паведаміць вам, а Вы, спадзяюся, праведзяце палітінфармацыю з падначаленымі ідэолагамі і цэнзарамі, што газета «Наша Ніва» афіцыйна зарэгістраваная ў Міністэрстве інфармацыі і мае аб тым пасведчанне. Гэтую газету прадаюць установы «Саюздруку». І гэта стала адной з прычынаў таго, што візавыя санкцыі для А.Лукашэнкі ЕС замарозіў яшчэ на 9 месяцаў.

Як дацэнт, кандыдат філасофскіх навук, які рэгулярна чытае «Нашу Ніву», сведчу Вам, што змест газеты такі, што яе можна браць за ўзор патрыятычнага выхавання вайскоўцаў. Больш за тое, з матэрыялаў «Нашай Нівы» можна даведацца пра жыццё і дзейнасць кіраўнікоў дзяржавы значна больш, чым з усіх вашых газетаў.

І напрыканцы для Вас дзве навіны: адна прыемная, другая дрэнная.

З якой пачаць? Пачну з прыемнай. Я дару Вам кнігу. Яна называецца «Беларусь — наша Радзіма». Гэта кніжка для першакласнікаў, але вельмі незвычайная. Не спяшайцеся адкідаць кнігу, бо на вокладцы ёсць яшчэ надпіс: «Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі першакласніку».

А зараз падрыхтуйцеся да непрыемнай навіны. Набярыце паветра і раскрыйце кнігу на 30-й старонцы. Расплюшчыце вочы і паверце ім.

Старонка называецца «Гісторыя і славутыя імёны бацькаўшчыны». А ніжэй вы бачыце выяву газеты «Наша Ніва» і фотаздымак будынку, дзе месцілася рэдакцыя «Нашай Нівы». Прэзідэнт лічыць сваім абавязкам распавесці першакласніку пра гістарычную падзею — выданне нацыянальнай газеты.

А вось Вашы афіцэры лічаць сваім абавязкам выкрадаць гэтую газету з пошты вайскоўцаў.

Факты антыпрэзідэнцкай антыпатрыятычнай дзейнасці Вашых падначаленых адносна «Нашай Нівы» наштурхнулі мяне на думку, што можа і па іншых кірунках прэзідэнцкай ідэалогіі Вашы афіцэры не ведаюць, што твораць.

Перагарніце кнігу для першакласніка ад прэзідэнта на старонку 28. Тут месціцца фотаздымак Кастуся Каліноўскага. Напісана, што ён кіраўнік паўстання 1863—1864 гадоў. Праверце, калі ласка, ці распавядаюць вашы ідэолагі вайскоўцам пра паўстанне пад кіраўніцтвам Каліноўскага, пра змест «Мужыцкай праўды», тэкст якой змешчаны на старонцы прэзідэнцкага падручніка.

Раю вам зрабіць наступнае.

Закупіць кнігу «Беларусь — наша Радзіма. Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі першакласніку» і раздаць для




вывучэння афіцэрам, якія займаюцца ідэалагічнай работай для вывучэння. Потым прыняць іспыты. Выпісаць «Нашу Ніву» ва ўсе палітпакоі вайсковых частак і рэгулярна абмяркоўваць з вайскоўцамі матэрыялы газеты.

Правесці конкурс на найлепшую вайсковую частку і надаць ёй імя Кастуся Каліноўскага.

Параіць усім афіцэрам, якія маюць дзетак першакласнікаў ці ўнукаў, вывучаць кніжку для першакласніка ад прэзідэнта разам з імі.

Жадаю Вам поспеху ў выхаванні патрыятызму вайскоўцаў Беларусі.

**P.S.** Не так даўно ў войска забралі хлопцаў з апазіцыі. Дык Вы, спадар міністр, даручыце ім праводзіць палітінфармацыі. Хай яны распавядаюць вайскоўцам пра міжнародную абстаноўку, праграму Усходняе партнёрства, пра эканамічны расійскі імперыялізм, тэзы, якія выказаў Лукашэнка. Хай хлопцы ездзяць па вайсковых частках і займаюцца патрыятычным выхаваннем. Яны ж кніжкі чытаюць і газеты, па Еўропе паездзілі, хай распавядаюць пра еўрастандарты жыцця. А то Вашы афіцэры задумалі з імі ваяваць — дарма. Тут як трэба разважаць: хто на кухара вучыўся — таго да пліты, хто кніжнік — хай прапагандай займаецца.

**Дацэнт, кандыдат філасофскіх навук**
**Уладзімір Падгол**

**Ад Рэдакцыі.** Пасля выступу Рэдакцыі ў справе дастаўкі «НН» падпісчыкам-вайскоўцам у дзвюх з трох часцей сітуацыя выправілася. Вестак з трэцяй часткі, дзе былі праблемы, пакуль не маем.

# Андрэй Арамнаў: «Я больш так не буду»

**«Я аформіў дакументы на ўласны легкавік, у выніку чаго не стрымаўся і выпіў піва».**

29 мая ў Барысаўскім міжгарнізонным вайсковым судзе была разгледжаная крымінальная справа ў дачыненні да алімпійскага чэмпіёна Андрэя Арамнава, якога паўторна затрымалі за рулём аўтамабіля ў стане алкагольнага ап'янення. За неаднаразовае кіраванне аўто ў нецвярозым стане алмпійскага чэмпіёна пакаралі штрафам у 150 базавых велічыняў (5 млн 250 тыс. рублёў).


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

На суд алімпійскі чэмпіён прыйшоў у аранжавай байцы з капюшонам у суправаджэнні пяці мужчынаў. Як высветлілася ў судзе, то былі трэнеры, прадстаўнікі спартыўнага клубу «Дынама».

Пабачыўшы фатографаў, Андрэй спыніўся перад брамай вайсковага суду. «Вы што, звар'яцелі?!» — запытаў ён у журналістаў, спрабуючы нацягнуць на галаву капюшон. Ягонаму трэнеру давялося некалькі разоў прасіць таго прайсці у суд. Спартовец ускочыў у будынак, нізка нахіліўшы галаву ды схаваўшыся за спіны сваіх таварышаў. Не абышлося без прыгодаў і ў зале суду: «Трэба было ў Пекіне фатаграфаваць! А то ў «Камсамолцы» толькі два здымкі было, і ўсё», — не сунімалася світа чэмпіёна. Журналістаў пры гэтым звінавацілі ў тым, што сёння Арамнаў не зможа трэніравацца, а яму ж трэба было ў гэты дзень «дзесяць тонаў падняць».

Акрамя журналістаў ды суправаджэння спартоўца ў судзе нікога не было — ні прыхільнікаў, ні родных. Адчувалася, што ў такой цеснай кампаніі прадстаўнікі прэсы былі нежаданымі гасцямі.

На судзе старшыняваў палкоўнік юстыцыі Каранеўскі А.П. На яго пытанні знакаміты парушальнік, які ў судзе бараніўся самастойна, адказваў нягучна, часта забываў устаць, калі да яго звяртаўся Высокі суд. «Вы не рыхтаваліся да пасяджэння?» — спытаў суддзя. «Я здагадваўся, якім будзе вынік, таму рыхтаваўся слаба», — быў адказ.

Са словаў дзяржаўнага абвінаваўцы стала вядома, што алімпійскага чэмпіёна двойчы затрымлівалі за кіраванне аўто ў нецвярозым стане — у снежні 2008 г. і лютым 2009 г. Пасля першага выпадку яго пазбавілі права кіраваць аўтамабілем тэрмінам на тры гады ды пакаралі штрафам у 1050000 рублёў. Другое затрыманне пацягнула за сабой крымінальную справу, якую распачалі ў сакавіку паводле ч. 2 арт. 317-1 КК (кіраванне транспартным сродкам асобай, якая знаходзіцца ў стане алкагольнага ап'янення, перадача кіравання транспартным сродкам такой асобе ці адмова ад праходжання праверкі (агляду)). Артыкул прадугледжвае пакаранне ў выглядзе штрафу, папраўчых працаў да двух гадоў ці арышту да шасці месяцаў.

Справу накіравалі ў вайсковы суд, бо Арамнаў ад студзеня 2008 году служыць на кантрактнай аснове інструктарам па фізічнай падрыхтоўцы ў сталічнай вайсковай часці № 5448 (ад верасня 2008 г. — прапаршчык).

Адказваючы на пытанні абвінаваўцы, Арамнаў казаў, што дакладна не памятае датаў, калі яго затрымлівалі. Па яго словах, у часе апошняга затрымання ён адмовіўся ад правядзення экспертызы, бо з «мінулага вопыту» ведаў, што алкаголь у крыві знойдуць.

«Тады я неяк не разумеў, што раблю. Цяпер усё зразумеў і раскайваюся». На пытанне суду, чаму ўсё ж ён парушаў правілы дарожнага руху, спартовец адказаў, што на яго паўплываў «вялікі поспех у Пекіне» і малады ўзрост. Спартовец не адзін раз ужыў у судзе слова «беспакаранасць», некалькі разоў паўтарыў, што не верыў, што ў той дзень (28 лютага — НН) яго могуць спыніць, што ўсё сыдзе з рук. Акурат пасля першага затрымання ён атрымаў трохпакаёўку ў сталіцы, іншыя ўзнагароды, а перад апошнім інцыдэнтам аформіў дакументы на ўласны легкавік, у выніку чаго не стрымаўся і «выпіў піва».

Абвінаваўца запатрабаваў для Андрэя Арамнава пакаранне ў выглядзе штрафу гэтым разам у пяць разоў большага.

«Я больш так не буду», — заявіў у апошнім слове абвінавачаны.

«У маім жыцці многае перавярнулася пасля гэтага здарэння, я адчуваю, што стаў дарослым, паразумнеў», — казаў алімпіец. Ён цалкам прызнаў сваю віну і раскаяўся. Высокі суд гэта ўлічыў і праз гадзіну вынес вердыкт, які цалкам супаў з прапанове дзяржаўнага абвінавачання. Вырак уступіць у сілу цягам дзесяці сутак, за гэты час Арамнаў можа абскардзіць яго ў Беларускім вайсковым судзе.

«У мяне ўсё нармальна! Чакайце новых заваёваў на сусветных спаборніцтвах!» — сказаў спартовец журналістам на развітанне. Выглядаў ён задаволеным.

**Сямён Печанко, Барысаў—Мінск**

# Машкевіч сустрэў 50-годдзе ў кампаніі Мілінкевіча і Шалкевіча

**31 траўня споўнілася 50 гадоў былому паслу Польшчы ў Беларусі Марыюшу Машкевічу, аднаму з аўтараў ідэі «Усходняга партнёрства». «Наша Ніва» павіншавала пана Машкевіча з юбілеем і задала некалькі пытанняў.**

**«Наша Ніва»: Пан Машкевіч, у якім настроі сустрэлі пяцідзесяцігоддзе?**

**Марыюш Машкевіч:** Сустрэў у добрай кампаніі сваіх беларускіх і польскіх сяброў у маім доме пад Варшавай, у Міхаловіцах. Былі Аляксандр Мілінкевіч, Уладзімір Падгол, Мікола Маркевіч, Тадэвуш Гавін, Віктар Шалкевіч, Пётра Рудкоўскі. Прэзентавалі кнігу «Беларусь у бок Еўропы», а таксама польскія пераклады Уладзіміра Арлова. Некаторыя іншыя кнігі, што выйшлі ў серыі Biblioteka Bialoruska Калегіуму Усходняй Еўропы. Як бачыце, нават дзень нараджэння святкаваў з беларусамі.

**«НН»: А ўвогуле, ці атрымліваецца сачыць за беларускімі падзеямі?**

**ММ:** Заўсёды з цікавасцю сачу за тым, што адбываецца ў Беларусі. Імкнуся быць у курсе вашых справаў. Штодня чытаю беларускія сайты, у тым ліку nn.by.

**«НН»: А як ацэньваеце тое, што беларускія ўлады абвясцілі курс на збліжэнне з Захадам?**

**ММ:** Складанае пытанне. Магу толькі сказаць, што рух у бок Еўропы замацоўвае беларускую незалежнасць.

**«НН»: А чым, увогуле, зараз займаецеся?**

**ММ:** Я кадравы работнік Міністэрства замежных справаў. Цяпер вось чакаю новага прызначэння. Таксама займаюся навуковай дзейнасцю.

**«НН»: Якія планы на бліжэйшыя 50 гадоў?**

**ММ:** Напісаць шмат кніжак. (Смяецца)

**Гутарыў Зміцер Панкавец**


svaboda.org
Машкевіч у беларускім судзе ў 2006-м.

**Марыюш Машкевіч**

(нар. у Ілаве 31 траўня 1959) — доктар гуманітарных навук, дыпламат, публіцыст. Заснавальнік першага польскага консульства ў Гродне, генеральны консул у Гродне ў 1994 — 1997 гадах. Пасол Польшчы ў Беларусі (1998 — 2002). 24 сакавіка 2006 быў затрыманы міліцыяй на Кастрычніцкім пляцы ў Мінску падчас пратэстаў прыхільнікаў перамен. Мінскі суд пакараў Машкевіча арыштам на 15 сутак.

**Невядомыя і малавядомыя факты з жыцця Марыюша Машкевіча, у якіх ён прызнаўся з нагоды 50-годдзя.**

**Ён аўтар скандальнага раману «Беларуска»**, які напісаў пад псеўданімам Марта Піньска ў часе працы паслом у Мінску. Раман уражвае дакладнасцю апісання беларускай рэальнасці і... адкрытасцю любоўных сцэнаў. У свой час у чытацка-літарацкіх колах было зламана нямала дзідаў, каб высветліць, хто ж аўтар гэтага раману.

**У маладосці Марыуш Машкевіч быў манахам,** жыў у кляштары. У сацыялістычнай Польшчы праз свае перакананні адмовіўся прымаць у войску прысягу і за гэта быў кінуты ў турму.

**Ён нашчадак беларуска-ліцвінскай шляхты,** Багуслава і Самуіла Маскевічаў — пісьменнікаў і грамадскіх дзеячаў XVI і XVII стст.

**Машкевіч — чалавек, які стаіць за праграмай «Усходняе партнёрства»,** ён адзін з бацькоў праекту, накіраванага на паляпшэнне адносінаў паміж Еўрасаюзам і Беларуссю.

# Апошні салдат «банды Марозава»

## Асуджаны адзін з самых страшных крымінальнікаў Беларусі.

Вярхоўны суд асудзіў аднаго з лідэраў злачыннага свету Гомельшчыны 55-гадовага Мікалая Салдаценку на 11 гадоў турмы строгага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці. Прысуд быў абвешчаны 2 чэрвеня.

Салдаценку, мянушка Салдат, прызналі вінаватым у вымагальніцтве па арт. 208 ч.3 КК Беларусі. Разам з ім на вялікія тэрміны асуджаныя Аляксандр Кавальчук, Мікалай Якаўлеў, Ігар Лявончыкаў і Андрэй Іваноў.

Следства ішло два гады. 17 ліпеня 2007 году Салдата затрымалі ў Расіі, у Маскоўскай вобласці, дзе ён хаваўся ад міжнароднага вышуку. Генеральная пракуратура Беларусі абвясціла яго ў вышук паводле артыкулаў 207 (рабаўніцтва), 285 (стварэнне злачыннай арганізацыі) і 286 (бандытызм) КК РБ. Аперацыя па затрыманні праводзілася пры ўдзеле супрацоўнікаў АМАП МУС Расіі «Рысь».

Паводле дадзеных следства, ён быў актыўным удзельнікам «банды Марозава», якая гадамі тэрарызавала Гомельшчыну, і адным з апошніх «марозаўцаў», якія гулялі на волі.

Суд быў закрыты і адбываўся ў СІЗА Мінску дзеля забеспячэння бяспекі яго ўдзельнікаў.

**Сямён Печанко**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Банда Марозава**

Справа арганізаванай злачыннай групоўкі, кіраванай Сяргеем Марозавым, стала самай гучнай крымінальнай справай апошняга часу.

На рахунку гэтай групоўкі больш за дзесятак забойстваў, напады, рэкет, гандаль зброяй. У 2003—2005 г. большасць бандытаў была затрыманая, а фактычнай ліквідацыяй «банды Марозава» стаў снежаньскі суд 2006 г., па выніках якога Сяргей Марозаў, Валеры Гарбаты і Ігар Данчанка былі прысуджаныя да расстрэлу. Астатніх членаў банды асудзілі на розныя тэрміны зняволення — ад 20 гадоў пазбаўлення да 2 гадоў «хіміі». Усяго па справе гэтай злачыннай арганізацыі праходзіла 46 чалавек.

Гомельская крымінальная гісторыя мела розгалас і таму, што ў справе былі замешаныя супрацоўнікі сілавых структураў, прадстаўнікі мясцовых уладаў. Так, былы кіраўнік Упраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй УУС Гомельскага аблвыканкаму па выніках суду атрымаў 18 гадоў зняволення, па справе Марозава праходзілі двое былых намеснікаў начальніка УУС вобласці.

### Выйшаў на волю шансанье Каліна

41-гадовы спявак Віктар Каліна, прыгавораны да пяці з паловай гадоў турэмнага зняволення, 29 мая выйшаў на волю. Ён адбываў пакаранне ў наваполацкай папраўчай калоніі № 10. Раней, 21 мая, вызваленая былая жонка спевака Святлана. Пасля выхаду з турмы В.Каліна заявіў, што хоча перайсці з беларускага ў расійскае грамадзянства. У 2007 годзе суд Першамайскага раёну Мінску прыгаварыў В.Каліну да пяці з паловай, а яго жонку — да чатырох з паловай гадоў пазбаўлення волі за махлярства са страхоўкамі на аўтамабілі.

**СП**



# З кім яшчэ спяваў Лукашэнка?

Дзяржтэлеканалы паказвалі, як у часе мінскага канцэрту пераможцы сёлетняга «Еўрабачання» Аляксандра Рыбака «Купалінку» падпяваў нават Аляксандр Лукашэнка, які сядзеў паміж дзвюма маладымі дзяўчатамі — бландзінкай і брунэткай.

Гэта не першы выпадак, калі кіраўнік дзяржавы спявае для піяру. Прычым рэпертуар мяняўся разам з палітычнай сітуацыяй.

Перад выбарамі 2001 году ў фільме РТР ён спяваў пад баян песню з рэпертуару Абадзінскага.

3 ліпеня 2007 году на афіцыйным канцэрце ў Мінску Лукашэнка падпяваў Валерыю Лявонцьеву: «Милый друг, не скучай, //Ты меня не забывай....».

На фестывалі «Славянскі базар ў Віцебску» ў 2008 годзе Лайма Вайкуле запрасіла Лукашэнку на белы танец пад «А вы вдвоём, но не со мною».

І вось гістарычны момант — «Цёмная ночка, а дзе ж твая дочка?..»

**СП**

## ЗДАРЭННІ

### На падлетка зваліўся звон

Здарылася гэта ў Жалудку, што на Гродзеншчыне. 31 мая пасля службы ва Успенскім касцёле двое дарослых і пяцёра школьнікаў выправіліся на званіцу, каб пазваніць у званы. Званілі дарослыя і дзеці, якія ў той дзень прыйшлі да першага прычасця. З умацаванняў абарваўся самы вялікі звон, які зачапіў 12-гадовага падлетка. Хлопец нарадзіўся ў кашулі — яго адразу ж накіравалі ў рэанімацыю, а 1 чэрвеня ўжо перавялі ў траўматалогію.

### У катастрофе загінулі два святары

У ноч на 1 чэрвеня на трасе Мінск — Бабруйск, блізу вёскі Баяры, адбылася аўтакатастрофа. У выніку загінулі настаяцель Свята-Мікола-Сафійскай царквы Бабруйску Аляксей Канаплёў, дыякан Свята-Мікольскага кафедральнага сабору Міхаіл Ярмолавіч, а таксама прыхаджанін Максім Міцура. Яшчэ адзін пасажыр, іераманах Нікадзім (Арцімовіч), знаходзіцца ў цяжкім стане.

Два гады таму ў айца Аляксея ў аўтакатастрофе загінула жонка Таццяна. Сіротамі засталіся пяцёра дзяцей.

**Aleskrasavin**



# Ваўкавыская готыка

Ваўкавыск—Гнезна—Шылавічы—Рэпля—Воўпа. Піша **Сяргей Харэўскі**.

Першае, што дзівіць чалавека, які ўпершыню прыязджае ў Ваўкавыск з Мінску — памеры. Вялікую частку гораду займае прыватны сектар, а за ім пачынаюцца прамысловыя зоны. Ваўкавыск стаў чыгуначным вузлом яшчэ ў 1885 г., калі паўз яго прайшла чыгунка Баранавічы—Беласток. Да сёння чыгунка з яе заўсёдным бадзёрым перазовам колаў вызначае шмат у чым тутэйшы вобраз.

Над горадам высіцца Шведская гара, па-тутэйшаму Муравельнік — славянскае гарадзішча Х стагоддзя. У Ваўкавыску, дарэчы, захавалася архаічная структура гораду: ён рэзка вырас толькі ў ХХ ст., перахоўваючы вялікую колькасць сядзібнай забудовы. Накірункі вуліц, былых Слонімскай, Шырокай, Віленскай, цалкам супадаюць з найстарэйшым з вядомых нам планаў гораду 1778 г.! На жаль, такіх старых будынкаў у горадзе не зберaглося. Хіба цяперашні музей імя Баграціёна. Лічыцца, што ў гэтым імпазантным сядзібным доме расійскі генерал, грузінскі князь Пётр Баграціён, кватараваў у 1812 г. У музей, дарэчы, варта зайсці.

У Ваўкавыску нямала помнікаў ХІХ ст.: манументальны касцёл Святога Вацлава, які пануе сярод малапавярховай забудовы, зграбная царква Святога Мікалая. Зберагліся кварталы «польскага часу» з цікавымі дэталямі, каванкамі, старымі дзвярыма... У такім Ваўкавыску нарадзіліся і вучыліся выбітны пецярбурскі дойлід Мар’ян Лялевіч і польскі геафізік Станіслаў Плева, слынныя шахматысты Давыд Яноўскі і Бенджамін Блюменфельд, легендарная савецкая «Папялушка» Яніна Жэймо, польскі актор Людвік Бяноцт і беларуска-расійскі Аляксандр Дзядзюшка.

Нейкі ёсць вітамін на Ваўкавышчыне, што родзяцца тут таленты.

І цяпер тут дзеіць заслужаны тэатр драмы і камедыі «Славуціч».

Дарэчы, з Ваўкавыску ж родам і адміністратыўны талент, Барыс Батура, колішні старшыня Магілёўскага аблвыканкаму, цяперашні старшыня савету рэспублікі.

Тут ёсць гатэль «Бярозка» (за царскім часам было пяць). Да бурных «Дажынак-2004» яго прывялі да ладу. Цяпер «Бярозка» — адзін з найлепшых у нашых райцэнтрах. Да тых жа Дажынак тут раскінулі вялізарны, рыхтык сталічны, пляц, абставілі яго кавярнямі, крамамі. Усё вечаровае жыццё праходзіць тут. Віруе моладзь.

Дарэчы, а як завуцца жыхары Ваўкавыску? Так, слушна — ваўкавычане і ваўкавычанкі.

Рэчка Рось і яе праток Ваўкавыя дзеляць горад на часткі. Назва Ваўкавыску паходзіць ад Ваўкавыі, што цячэ ў старым горадзе, акурат ля музею. На рэчках наставілі бетонных канструкцый, нарабілі ставоў, расчысцілі месцы для паркаў. Але рэчкі замалыя для такіх чынавенскіх забавак. Як і горад замалы для цэнтральнай плошчы, дзе замест стаячага Леніна — ляжачы воўк. Драпежны звер — сімвал Ваўкавыску, што сышоў з сярэднявечнага гербу.

Жывыя ваўкі ў ваколіцах рэдкасць. Ваўкавышчына — край не дзікі. Лясы займаюць менш за чвэрць раёну... Але пад самым Ваўкавыскам застаўся чароўны абшар Замкавага лесу — гушчар з сунічнымі палянамі. У нетрах вас сустрэне славуты цар-дуб, якому паўтысячы гадоў. Тутсама можна натрапіць і на рэдкі з рэдкіх чырвоны пылкагалоўнік — рэліктавую паўднёвую кветку. Яе высокія стромыя цыбукі вянчаюць буйныя лілова-чырванавата-ружовыя суквецці. Тут багата дзіўных раслінаў. Сунічны водар мяняецца малінавым, затым хваёвым, жывічным, гаючым....

**Касцёл у Гнезне — трэці па старшынстве ў Беларусі — шэдэўр абарончай готыкі.**


RADZIMA.ORG

**Міхайлаўскі касцёл у Гнезне**
Фундаваны Шамятовічамі ў 1524. У 1555 уласнік Геранім Хадкевічператварыў касцёл у кальвінскі збор. Вернуты католікам у 1643. Пабудаваны ў формах цэнтральнаеўрапейскай готыкі, але кальвіністы прыдалі яму рэнесансавыя рысы. Яго суцэльны глухі паўночны фасад традыцыйны для беларускага гатычнага дойлідства, зроблены так з мэтай большай ваеннай бяспекі і ўцяплення. У 1876 касцёл перараблялі на царкву, з поўдня прыбудавалі бабінец у псеўдарускім стылі. Ён быў перароблены пад готыку ў 1930–я і такім ацалеў да нашага часу.

## Наша Гнезна

Старажытнае Гнезна побач з Ваўкавыскам, як выехаць з яго на Захад. Тут ацалеў шэдэўр гатычнае архітэктуры — фарны Міхайлаўскі касцёл XVI ст. Трэці па старшынстве муараваны касцёл у Беларусі, пасля касцёлаў ва Уселюбе і Ішкалдзі. Ёсць паданні, што ён заснаваны ў 1121 г. Легендарная дата нават красавалася на фасадзе будынку. Але гэта прыгожы міф, проста Гнезна пад Ваўкавыскам блытаюць з аднайменным старажытным местам у Польшчы.

Храм у Гнезна шматкроць разбуралі, але ён уваскрасаў, бы Фенікс. Яшчэ пры канцы 1980-х храм быў без даху, закіданы смеццем...

Тутэйшы ксёндз, айцец Людвік Казімір Станішэўскі, чалавек гасцінны, жвавы і дасціпны, гаворыць на дзіўнай польска-беларуска-расійскай, уласнай, гаворцы. Ён прыехаў сюды з Польшчы яшчэ ў 1989 г. на пахаванне знаёмага святара, а тагачасны біскуп гродзенскі Тадэвуш Кандрусевіч угаварыў яго застацца на нейкі час. Часовае прызначэнне расцягнулася на дваццаць гадоў. Яго рупнасцю касцёл быў аднаўлены і асвечаны. Імша тут вядзецца папольску, але шлюбы і хрэсьбіны часцей просяць па-беларуску. «Як калі», — усміхаецца ксёндз. Ён можа прынагодна працытаваць і Янку Купалу.

А яшчэ ксёндз Людвік рас-


RADZIMA.ORG

**Гатычная каменная чаша для мыцця рук у Міхайлаўскім касцёле.**




**Ваўкавыск**
Раённы цэнтр, жыве 47 тыс. чалавек. Першая згадка — 1005. У 1052 згадваецца як памежная цвердзь. Атрымаў Магдэбургскае права ў 1503. Герб — у блакітным полі выява галавы ваўка.

павёў, што аднаго разу прыйшоў да яго горкі п'яніца. Аддаў мех, сказаўшы, што гэта мусіць належаць касцёлу... У мяху было старасвецкае распяцце, што цяпер сустракае вернікаў у прытворы. Там знайшлася і скульптура Святога Антонія Падуанскага XVI ст., што лічылася страчанай... Гэты выдатны твор правінцыйнае готыкі перахоўваецца ў плябані.

У Гнезне ж захаваўся дагледжаны парк пры старасвецкай сядзібе Тарасовічаў. І сам сарадаўні палацык, нібы з кніжкі, хоць яму хутка будзе 200 гадоў. Цяпер тут клуб.

Зацішны парк, каналы і ставы, добрыя дарогі — на ўсё гэта варта паглядзець з шыкоўнай галерэі пад калонамі на другім паверсе палацу. Адчуць сябе на досвітку XIX стагоддзя... Гатовая дэкарацыя.

### Емяльянава і Шылавічы

Яшчэ адзін гатычны храм, царква Аляксандра Неўскага, стаіць у Емяльянаве, што між Дзявяткаўцамі і Кузьмічамі. Гэтая святыня была каталіцкай капліцаю, а пасля паўстання Каліноўскага яе перарабілі на праваслаўную царкву.

Мястэчка Шылавічы мае ўласны цуд — вялізарны касцёл Тройцы. Вялізарны прыгажэзны храм відаць здалёк. Абавязкова падыміцеся на хоры, на вежу, з якой адкрываецца велічны краявід.

### Рэпля

Тут нарадзіўся і вырас Язэп Найдзюк — выбітны рэдактар і гісторык. На ўскрайку Рэплі ёсць старыя могілкі з дзіўнай архітэктуры капліцаю-пахавальняй. Нібы нейкае астранамічнае збудаванне стаіць пасярод крыжоў. Адсюль адкрываецца шыкоўны від на ўсю Рэплю і яе цудоўны храм.

### Воўпа

Старажытнае мястэчка Воўпа вядомае з XVI ст. Тут ёсць цікавы драўляны касцёл, старая царкоўка пры могілках і тузін старасвецкіх камяніцаў. Некалі была і вялізарная прыгожая сінагога. Эліза Ажэшка знайш-

**У Воўне — найбольшы драўляны храм Беларусі.**

ла ў Воўпе тэму для знакамітай навэлы «Гедалі» і тым праславіла яго. Сёння галоўнай рэліквіяй Воўпы ёсць касцёл Святога Яна Хрысьціцеля, пабудаваны ў 1773 г. Нельга застацца абыякавым, гледзячы на шыкоўную аздобу святыні, «мармуровыя» калоны, залатыя і сярэбраныя вінаградныя гронкі, скульптуры святых і анёлаў... І ўсё гэтае хараство цалкам зробленае з дрэва. Такога вы нідзе болей не пабачыце. Сёння гэта самы вялікі драўляны храм на тэрыторыі Беларусі. Выключную каштоўнасць яму надае разьблёны алтар, перанесены сюды з старажытнага касцёла-папярэдніка. Алтар зроблены ў чорных танах з залачонымі і пасярэбранымі дэталямі.

...Тутсама, у Воўпе, ёсць чысцюткія белыя пляжы, сасновы бор на беразе прыгожага Воўпінскага вадасховішча. Можна выдатна адпачыць, пакарміць лебедзяў ці пагуляцца ў рыбака, палавіўшы ладных падлешчыкаў. На беразе вялікае вады, у маляўнічай даліне, ёсць і санаторый, дзе зусім нядорага можна і заначаваць на пару дзён, і пасталавацца. Адно варта папярэдне замаўляць цёплае месца.

**Воўпа**
Мястэчка. Першая згадка — 1449, калі вялікі князь Казімір Ягайлавіч падараваў Воўпу Алехну Судымонтавічу. Апошні ў 1478 фундаваў там касцёл.
Магдэбургскае права атрымала ў 1792, герб — бабёр у блакітным полі.



RADZIMA.ORG

### Цырымонія ўручэння прэміі ARCHE ў Магілёве

**11 чэрвеня ў Магілёве (Цэнтр «Кола», зав.Чкалава 16)** адбудзецца ўрачыстая цырымонія ўручэння прэміі часопісу ARCHE «За сумленнае слова» за 2009 год ураджэнцу гораду над Дняпром гісторыку Рашэду Чаўдхуры. Удзел возьме рэдактар часопісу Валер Булгакаў. Лаўрэат выступіць з прамовай. **Пачатак а 18.30.**

### Акадэміку Міхайлаву — 70

27 траўня споўнілася 70 гадоў рэктару Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту Анатолю Міхайлаву. Міхайлаў нарадзіўся ў 1939 годзе ў Пензенскай вобласці (Расія). Скончыў БДУ (1961), дзе потым выкладаў філасофію.

Рэдакцыя НН далучаецца да віншаванняў.

## ПОШТА РЭДАКЦЫІ

### Помнік баламуту

30 траўня ў Полацку з'явіўся помнік яшчэ аднаму князю — Андрэю Полацкаму. Ён пастаўлены ў невялікім двары ля скрыжавання вуліц Ніжне-Пакроўскай і Энгельса. Гэта ўжо трэцяя асоба княскага роду пасля Усяслава Брачыслававіча і Прадславы Святаславаўны (Св.Еўфрасінні). Першых дваіх прадстаўляць не трэба, але чым так заслужыўся перад горадам Андрэй Полацкі?

У якасці абгрунтавання кажуць, што гэта апошні полацкі князь. Аднак Андрэй атрымаў гэты пасад не ў спадчыну, але прыняў з рук вялікага князя літоўскага, фактычна выконваў абавязкі намесніка.

Андрэй, пры нараджэнні Вігунд, быў старэйшым сынам Альгерда. Напачатку ён княжыў у Пскове. Як бацька стаў вялікім князем, Андрэй быў прызначаны ў Полацк. Пскавічы абурыліся, што князь з'ехаў, пазбавілі яго пасаду. Гэта выклікала дзесяцігадовы полацка-пскоўскі ўзброены канфлікт.

Пасля прыходу да ўлады Ягайлы Андрэй узбунтаваўся, збег у Пскоў. На загад маскоўскага князя ваяваў гарады ВКЛ Трубчэўск і Старадуб. І нарэшце, на маю думку, вызначальная прычына ўсталявання помніку: на Куліковым полі Андрэй быў на «правільным» баку і бараніў Маскву ад Мамая.

Пасля, не маючы рэсурсаў для змагання з Ягайлам, ён перадае крыжакам Полацкае княства, каб ад іх імя кіраваць у Полацку. Апрача таго, змаўляецца з князем смаленскім Святаславам і ў 1386 г. разам з ім жорстка нішчыць Полацкую зямлю. Кааліцыя пацярпела паразу, Андрэя ўвязнілі, ён збег, дабраўся да Пскова, дзе ў трэці раз



заняў пасад. Урэшце, замірыўся з князем Вітаўтам. Загінуў у бітве з татарамі на Ворскле (1399).

Чаму менавіта князю Андрэю пастаўлены помнік? Як альтэрнатыву варта б было рагледзець хаця б кандыдатуру другога Альгердавіча, Свідрыгайлы. Пры ім Полацк на кароткі час вярнуў статус сталіцы Вялікага княства Рускага, а месцічы набылі вольнасці. Правы гэтыя ў іх не адважыліся адняць наступныя вялікія князі, і тое сталася грунтам для развіцця гораду аж да набыцця ў 1498 г. Магдэбургскага права.

**Міхась Баўтовіч, Полацк**

## НОВЫЯ КНІГІ

### Народная мама

**Паслаў бы табе душу... Ліставанне Рыгора Барадуліна з мамай (1954-1971).** — Мінск: Лімарыус, 2009. — 274с., 500 ас.




Народны паэт Рыгор Барадулін дае нам майстар-клас па напісанні лістоў да маці ў расстанні. «Цалую твае ручкі, твае заінеўшыя скроні», «зямным паклонам кланяюся табе», «зязюленька мая баравая, зязюленька шэрая»... Слодыч без саладжавасці, сакавітасць без даўкасці. Мёд і яблыкі. Сыны і дочкі, гэтак пішыце сваім маткам!

Як усякі сын сваёй маці, у лістах трохі казырыцца і фарсуніцца, ужывае дробныя хітрыкі, але гэта, можа быць, адзін з тых рэдкіх выпадкаў, калі хлусня дарэчы. Што трэба, яна зразумее. Як жартам яна піша ў адным лісце пасля чарговай сынавай бравады: «Ну, каму ж тады салгаць, калі не маме?!»

«Мой сынок, якая я шчаслівая табой...» Сучаснікі сведчаць, што паэтычны зарад у Куліны Андрэеўны Барадулінай быў, можа, і мацнейшы, чым у самога дзядзькі Рыгора. Гэта кніга не для бацькоў: ім не трэба вучыцца пісаць да сваіх дзяцей.

А яшчэ ўсякае ліставанне – голас эпохі, і таму тут лісты маладзёна, які з невялікага мястэчка Вушачы паехаў у вялікі свет, агромністы Мінск — гэта жывыя сведчанні з 50-70-х гадоў XX стагоддзя, з часоў масавай міграцыі вёскі, момант вялікага беларускага разрыву, калі краіна, на дабро ці на шкоду, збольшага стала такой, якой мы яе ведаем сёння.

Да ліставання дасціпную прадмову, якая пачынаецца словамі «SMS, e-mail...», напісаў Уладзімір Някляеў.

### З чорнага ганку

**Деды. Дайджест публикаций о белорусской истории. Выпуск 1.** — Мінск, 2009.




«Мэта праекту — пазнаёміць беларусаў са сваёй гісторыяй, — кажа укладальнік альманаху Анатоль Тарас. — Навучыць ганарыцца ўласнай мінуўшчынай. Чаму па-расійску? Дык лепей з чорнага ганку, цішком, каб да свядомасці беларуса, які не чытае па-беларуску, трапіла праўда пра гістарычную мінуўшчыну».

Матэрыял для дайджэсту бярэцца з «Беларускага гістарычнага агляду», ARCHE і «Спадчыны», «Лідскага летапісца» і гродзенскай «Гістарычнай брамы». Найбольш увагі плануецца надаваць двум апошнім стагоддзям. «Але закранем і ранейшыя: у наступным нумары будзе пра бітву на Сініх Водах», — кажа выдаўца.

Дайджэст мае выходзіць чатыры разы на год сціплым накладам у 150 асобнікаў. Але А.Тарас, аўтар папулярнай кнігі «Анатомия ненависти. Русско-польские конфликты XVIII—XX вв.», праблемы ў тым не бачыць: «Будзе разыходзіцца — надрукуем яшчэ».

**Лявон К**

# Сокалаў-Воюш: Беланогая — гэта адкрыццё

Пасля трохгадовай адсутнасці легендарны бард Сяржук Сокалаў-Воюш зноў на Радзіме.

**«Наша Ніва»: Сяржук, як вас сустрэлі ў Беларусі?**

**Сяржук Сокалаў-Воюш:** Я прыехаў па асабістых прычынах — канцэртаў не планаваў. Але заўжды знаходзяцца людзі, якія хочуць паслухаць мае песні. Мае канцэрты стыхійныя, як мітынгі. Былі і гэтым разам цікавыя сустрэчы ў Наваполацку і Мінску.

**«НН»: Ці слухаеце вы творы іншых беларускіх творцаў, бардаў?**

**ССВ:** Беланогая — гэта адкрыццё. Фантастычная дзяўчына. У яе праўдзівая лірыка — адчуваецца трагедыя ўнутраная, падазраю, нешчаслівае каханне, бо яна ўвесь час вакол гэтай тэмы ходзіць. Вельмі таленавітае дзяўчо. Ну, з Бартосікам падтрымліваю адносіны, вось зараз ездзілі разам, выступалі.

**«НН»: Вы пераклалі песню Аляксандра Рыбака і амаль аднячасова з ім прыехалі на зямлю продкаў. Вы часам не сустракаліся?**

**ССВ:** Ой, не. Ну, пра што мы з ім гаварылі б?! Я б яму пачаў мазгі мыць наконт беларушчыны (смяецца). Не ведаю, ці яму, амаль замежніку, было б цікава.



Цяпер разам з сынамі Светавітам і Славамірам і жонкай Ганнай (дачкой вядомага беларускага дзеяча Францішка Бартуля) ён жыве ў ЗША, штаце Нью-Джэрсі, у гарадку з вялікай беларускай прысутнасцю Саўт-Рыверы.

**«НН»: Што змянілася ў ЗША пасля абрання Абамы?**

**ССВ:** Невялічкія змены — але яны ёсць, у бок сацыялізму. Майму старэйшаму сыну гэта балюча назіраць. Ён працаваў у перадвыбарчым штабе Макейна: расклейваў улёткі, агітаваў.

**«НН»: Ці адчулі беларусы ЗША крызіс?**

**ССВ:** У беларусаў ёсць такая адметнасць — яны вельмі паважна ставяцца да адукацыі. Яна хоць вельмі дарагая ($25 тысяч за год), але бацькі рупяцца, каб іх дзеці пайшлі ў каледж. І таму сярод беларусаў Амерыкі крызіс моцна не адчуваецца, усе, дзякуючы адукацыі, уладкаваныя на прыстойных працах.

**«НН»: Ці ўплываюць беларусы Амерыкі на падзеі ў Беларусі?**

**ССВ:** Тут сякія-такія станоўчыя змены ёсць, і да гэтага таксама прыклаліся амерыканскія беларусы. Паспрыялі, як мінімум. Яны пішуць петыцыі, выходзяць на дэманстрацыі ў Нью-Ёрку. Мы пісалі паштоўкі актывістам, якіх забралі ў войска. Уявіце, салдату прыходзіць куча паштовак з Амерыкі. Тут і хлопцу падтрымка, і іншыя салдаты зацікавяцца хоць трошкі тым хлопцам, а праз яго беларушчынай.

**«НН»: Чым займаецеся ў Амерыцы?**

**ССВ:** Хатні гаспадар: гатую ежу і рамантую дом. Мы падлічылі: танней будзе, калі наш стары дом адрамантую я, а не рамонтнікі.

**«НН»: Пішаце што?**

**ССВ:** Працяг раману «Крывавы памол». Аднячасова склаў «Тлумачальны слоўнік Асманскай імперыі». Раман дакументальны, і маім героям, гістарычным асобам, собіла паехаць у Крымскае ханства, пра якое я нічога не ведаў. І так, пакрысе вызнаючы пра Ханства і пра Асманскую імперыю, у мяне склаўся слоўнік на 500 старонак. Тут упершыню па-беларуску біяграфіі ханаў, султанаў, агульныя звесткі пра той экзатычны край, спісы пасольў Вялікага Княства...

**«НН»: Шкадуеце, што з'ехалі 15 гадоў таму?**

**ССВ:** Я з'язджаў з мэтай вярнуцца. У мяне тут кватэра, якую я не прадаю. Як нешта адбываецца на Беларусі, дык мне гэта вельмі складана перажываецца. Напрыклад, мітынг, дзе я мог бы падтрымаць песняй. Мой дзень у Амерыцы пачынаецца з слухання беларускіх навінаў, потым я вязу сыноў у школу, і сыны заўсёды пытаюцца пра Беларусь.

**Гутарыў Павал Касцюкевіч**

# Пластылінавы «БелАЗ»

У Расіі знялі мультсерыял «Гара каштоўных камянёў» паводле казак розных народаў, якія жывуць на тэрыторыі РФ. Гэта найбуйнейшы праект у гісторыі расійскай анімацыі: агулам створана 52 мультфільмы па 13 хвілін (разам атрымліваецца 11 гадзін).



Грошы на праект давала дзяржава, таму, натуральна, не абыходзіцца і без пэўных ідэалагічна-выхаваўчых момантаў. Кожны мульцік пачынаецца невялічкім аповедам пра народ, паводле чыёй казкі ён зняты. Вось, напрыклад, у мультфільме па матывах беларускай казкі «Як пан канём быў» распавядаецца, што «з даўніх часоў беларускіх камнярэзаў і жывапісцаў запрашалі ў Расію. Нават сцэны збройнай палаты маскоўскага Крамля ўпрыгожаныя беларускімі майстрамі».

Як «запрашалі» беларускіх майстроў мы добра ведаем: у якасці палонных у часе шматлікіх войнаў паміж ВКЛ ды Маскоўскім княствам. Увогуле, мультфільм выявіў, што ўяўленне пра Беларусь у расійскіх аніматараў досыць прыблізнае: сімвалы сучаснай Беларусі — зубры ды «БелАЗы», а казачныя мужыкі размаўляюць з нейкім дзіўным валагодскім акцэнтам. Зрэшты, цікава, што ў пэўным сэнсе мультфільм не пазбаўлены і самакрытыкі: пан-прыгнятальнік — тыповы расійскі пан, а царскія жаўнеры — спрэс недарэкі ды бяздумныя служкі, якія стаяць на «зважай» перад помнікам. У тэхнічным плане мультфільм зняты бездакорна — нездарма яго стварэннем займалася знакамітая студыя «Пілот».

**Алесь Бондар**

# Тэрмінатар супраць Лінкальна

«Вось Зла» канчаткова сфармаваная: Амон Ра, Напалеон, Аль Капонэ і Іван Жахлівы. Неверагодная сіла магіі ў сцэнах вашынгтонскага музею злучае найвялікшых злыдняў у хісткі, але пагрозлівы хаўрус. Яны ўзброеныя дзідамі, алебардамі, аўтаматамі і наганамі і маюць у сваім распараджэнні атрады маскоўскіх віцязяў, французскіх гвардзейцаў і міфічных птушкалюдзей. Хто здолее супрацьстаяць гэтай старажытнай навале, калі не простыя амерыканец, былы музейны ахоўнік, а цяпер паспяховы бізнэсмэн, наш стары знаёмец Лары?





Выканаўца галоўнай ролі, актор Бэн Стылер кажа: «У другой частцы яшчэ больш цудаў (якія сёй-той назаве спецэфектамі), яшчэ больш дуэляў (якія сёй-той назаве экшэнам). У адрозненні ад першай серыі, мой герой ужо дасведчаны змагар са старадаўнімі злыднямі, і выдатна ведае, як паводзіцца з раптам ажылымі экспанатамі — нават з прыгожымі авіяторкамі 1940-х гадоў».

Поспех блакбастэра прынята папярэдне ацэньваць паводле яго поспеху ў амерыканскага гледача. У дадатак шмат чаго вызначае першы уік-энд пракату. Сёлета прэм'еры двух прыгодніцкіх фільмаў, «Ноч у музеі-2» і «Тэрмінатар-4: Збавенне», прыпалі на адныя выхадныя. Музейшчыкі перамаглі— зарабілі $70 млн. Сума нечакана вялікая, улічваючы, што за першую частку яны атрымалі ўдвая менш. Пракатчыкі ж чацвёртага «Тэрмінатара» мусілі задаволіцца сумай у $54 млн. «Задаволіцца» — бо гаворка ідзе пра фільм з фантастычным бюджэтам у $200 млн. Трэба было, мусіць, часцей выпускаць Шварцнэгера: ён у кадры з'яўляецца эпізадычна, а галоўнага змагара супраць панавання машын грае Крысціян Бейл.

Бітва за гледача працягваецца і на тэрыторыі Беларусі: фільм «Ноч у музеі-2» — ужо на экранах, а чацвёрты «Тэрмінатар» з'явіцца ад чацвярга.

**Павал Касцюкевіч**

КАЛЯНДАР

## Чэрвень

**1** — Міжнародны дзень абароны дзяцей.

**1** — 575 гадоў таму (1434) памёр вялікі князь і польскі кароль Ягайла.

**4** — 375 гадоў таму (1634) Паляноўскім мірам скончылася Смаленская вайна паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай. Сярод яго ўмоваў значылася, што Маскоўскае княства мае выплаціць Рэчы Паспалітай 20 тысяч рублёў, што на сённяшнія грошы складае $2 млрд.

**13** — 175 гадоў таму (1834) нарадзіўся Канстанцін Вераніцын (в. Астраўляны Віцебскага павету), аўтар паэмы «Тарас на Парнасе».

**16** — 175 гадоў таму (1834) нарадзіўся Аляксандр Ельскі, беларускі краязнавец, гісторык, публіцыст. У сваім маёнтку Замосце (Ігуменскі павет) арганізаваў прыватны краязнаўчы музей. Выдаў зборнік «100 прыказак, загадак, прыдумак і гавэндаў для пажытку беларускага (крывіцкага) народу».

**23** — Купалле.

**26** — 100 гадоў таму нарадзіўся Антон Адамовіч, пісьменнік, літаратуразнаўца.

**27** — Юбілей беларускага метро. 25 гадоў таму (1984) была ўведзеная ў эксплуатацыю першая лінія мінскага метрапалітэну.

**28** — Сабор (свята) Усіх Беларускіх Святых.

**29** — Пятра і Паўла ў каталікоў, уніятаў.

**Уклаў ЛК**

# Пад каго стваралася ВКЛ

**Такая знаёмая нам сёння назва Вялікае Княства Літоўскае на дзвесце гадоў маладзейшая за саму тую дзяржаву. Піша Алег Дзярновіч.**

### Калі Літва была каралеўствам

Тытул манарха мае вялікае сімвалічнае значэнне. Гэта публічная маніфестацыя статусу і, у пэўным сэнсе, замежнапалітычнай арыентацыі. Напрыклад, першых кіеўскіх князёў летапісцы часам называлі «каганамі», што сведчыла пра моцную яшчэ повязь з іудзеямі-хазарамі. Уладары літоўскія ад самага пачатку вымушаныя былі дэманстраваць прыхільнасць да заходняга вектару развіцця. Каб гуляць на адным палітычным і вайсковым полі з Польшчай і крыжакімі Ордэнамі, трэба было мець з імі роўны статус. Інакш, па жорсткіх законах тых часоў, суседзі ўспрымалі б Літву як плямёны дзікуноў, вартыя толькі асіміляцыі і вынішчэння.

Таму Міндоўг (гады кіравання 1250-я—1263), які стварыў вакол Наваградку новую дзяржаву, хрысціцца ў каталіцтва і ў 1253 г. карануецца каралеўскай каронай, дасланай Папам Інакенціем IV. «Божай міласцю кароль Літвы» — так называюць Міндоўга ў дакументах яго канцылярыі 1253—1261 гг. У сваю чаргу Папы Інакенцій IV і Аляксандр IV звярталіся да Міндоўга, як да «найяснейшага караля Літвы». Што характэрна, Папа называе Міндоўга каралём і звяртаецца да яго так яшчэ да афіцыйнага каранавання, але пасля хросту. І пасля дзяржаўнага перавароту, калі змоўшчыкі Даўмонт, Таўцівіл і Транята забілі Міндоўга, Папа у адным з афіцыйных лістоў выказвае шкадаванне з нагоды смерці «нашага хрысціянскага караля, забітага паганцамі».



Вялікі князь Вітаўт.

### Наступны этап: герцагства Літоўскае

Наступным кіраўніком дзяржавы, які строга сачыў за паслядоўным ужываннем свайго тытулу, быў Гедымін (1316—1341). У актах, якія выходзяць ад яго імя, ён першым з літоўскіх князёў пачаў называць сябе «каралём ліцвінаў і русінаў». Напрыклад, дакоры крыжакам, якія адмаўляліся выдаць дзве тысячы збеглых у Ордэн смердаў, прыходзілі за такім подпісам. Так звярталіся да кіраўніка літоўскай дзяржавы заходнія ўладары і нямецкая Ганза. У нямецкамоўнай карэспандэнцыі Гедымін падпісваецца таксама «скарочанай формулай» — «кароль літоўцаў»: «konig van Lettouen».

Часам Гедымін называўся «dux» — «князь» ці ў заходняй традыцыі — «герцаг». Герцагствы тады не саступалі каралеўствам. Згадаем змаганне Французскага Каралеўства і Вялікага Герцагства Бургундскага.

Каралеўскі тытул зрэдку ўжываўся ў дыпламатычнай перапісцы і пасля Гедыміна. Альгерд (1341—1377) быў «каралём Літвы», «вялікім каралём», але таксама і «найвышэйшым князем» і «вялікім князем». Ягайла (1382—1391) яшчэ да хрышчэння ў каталіцтва зваўся «каралём», «вялікім каралём», «вялікім князем», «найвышэйшым каралём», «найвышэйшым князем». То бок вялікай розніцы між «каралём» і «князем» літоўскія ўладары тады не бачылі.

Хоць у суседскіх хроніках гэта выклікала блытаніну. Бо словы князь/герцаг у розных мовах па-рознаму перакладаюцца. Калі старабеларуская і польская тэрміналогія ведаюць толькі аднаго «князя» і «ksikcia», дык у лаціне існуе два тэрміны — «princeps» і «dux», як і ў нямецкай мове — «Fьrst» і «Herzog».

Тытул «кароль ліцвінаў» трымаўся нароўні з «князем» да Крэўскай уніі (1385 г.), падчас якой Польшча і Літва заявілі пра інтэграцыйныя памкненні. Адразу ж пасля яе тэрмін «konig» («кароль») у дачыненні да вялікага князя літоўскага перастае ўжывацца ў нямецкамоўных крыніцах. Выключэнне — калі вялікі князь быў адначасова і польскім каралём, як Ягайла.

### Ледзь не сталі Польскім каралеўствам

У лацінскіх актах яшчэ до хросту Ягайлу называюць «dux». У далейшым — «supremus dux» («найвялікшы князь»), а ад сярэдзіны 1386 г. усталёўваецца тэрмін «princeps» («валадар»), а «dux» знікае. «Princeps» — гэта болей, чым «dux», але ж меней, чым «rex» («кароль»). Функцыяй «princeps» было адрозненне Ягайлы ад падлеглых яму ліцвінскіх князёў. З'яўленне тытулу «princeps» магло выконваць ролю «кампенсацыі» за спыненне ўжывання тэрміну «кароль» да кіраўніка Літоўскай дзяржавы.

Цяпер, пасля Крэва, хрышчэння і каранацыі, Ягайла стаў «каралём Польшчы, найвышэйшым князем літоўскім і дзедзічам рускім». З юрыдычнага пункту гледжання пункты Крэўскай дамовы прадугледжвалі інкарпарацыю Літоўска-Беларускай дзяржавы ў склад Польскай Кароны. Але на практыцы ажыццявіць «інтэграцыю» не ўдалося. Дзякуючы актыўнасці грамадскіх сілаў краю, незадаволеных умовамі, якія прапанаваў польскі бок, паглынанне дзяржавы нашых продкаў Польшчай так і засталося на паперы.

### Які князь вялікшы?

Літоўскія незалежніцкія памкненні ўвасабляў Вітаўт. Дакладней, выкарыстоўваў іх у барацьбе за ўладу з стрыечным братам Ягайлам, каралём і «найвышэйшым князем». У 1392 г. апошні быў змушаны перадаць Вітаўту кантроль над літоўска-рускімі землямі, але зваўся Вітаўт проста «князем». «Вялікім князем» ён стаў сябе называць ад студзеня 1401 г. Тады ў Вільні была падпісаная Віленска-Радамская унія. Гэты акт прызнаваў палітычную асобнасць Літоўскага княства да смерці Вітаўта. Пасля яе ўлада мусіла перайсці да Ягайлы ці яго пераемнікаў. Кракаў прызнаваў афіцыйны тытул Вітаўта, але і той вымушаны быў пайсці на значныя саступкі — палітычная вага Вільні падупала пасля катастрофы на Ворскле (1399 г.), дзе татары высеклі большую частку літоўска-рускага войска.

І ўсё ж браты-князі не пераставалі спрачацца пра свае правы на княства і свой статус у ім. Сагнуць Ягайлу Вітаўт змог толькі пасля Грунвальду. У 1411 г. асобным актам Ягайла афіцыйна прызнаў за Вітаўтам тытул «magnus dux» («вялікі князь»). Польскі кароль фармальна застаўся суверэнам дзяржавы — «princeps», а тэрмін «dux» знік з яго тытулу.

Вітаўт не думаў спыняцца на гэтым. Наступнай сваёй задачай ён бачыў атрыманне каралеўскай кароны, роўнай Ягайлавай. А там — хто ведае: магутнасць літоўска-рускага княства расце, Ягайла старэе... Аднак карона Вітаўта, якую везлі з Рыму, «згубілася» на польскіх дарогах. І ўсё ж, дзякуючы тым спробам вялікага князя, яго дзяржава займела нарэшце афіцыйную назву.

### Дзень народзінаў ВКЛ

Яшчэ і пасля Крэўскай уніі ў дакументах яе называюць і terra Letouie et Russie, і terra Lithuaniae, і terrae Litwania et Russia (зямля літоўцаў і русінаў; зямля Літоўская; Літоўская і Руская зямля)... Але ж усё гэта — апісальныя назвы, але не афіцыйны тытул дзяржавы!

Толькі ў 1419 г. у сумесным дакуменце Ягайлы і Вітаўта сустракаецца назва «ducatus Litwanie» («княства Літоўскае»). А тытул дзяржавы «Magnus Ducatus» («Вялікае Княства») упершыню быў запісаны толькі 2 студзеня 1430 г. у адным з актаў, складзеных якраз у той час, калі Вітаўт чакаў літоўскую каралеўскую карону. І далей пачаў выкарыстоўвацца рэгулярна.

Фактычна, тытул дзяржавы быў утвораны ад тытулу вялікага князя Вітаўта. Выходзіць, пад яго, пад уладара з ягонымі амбіцыямі і правамі, фармавалася дзяржава.

У 1411 г. тытул «вялікі князь» выконваў функцыю адрознення Вітаўта ад іншых князёў дзяржавы і не быў яшчэ ў поўным сэнсе тытулам манарха. Толькі з 1430 г. тытул «вялікі князь» становіцца канчаткова адпаведным тытулу дзяржавы, назва якой паўстае ў той форме, якая нам сёння так знаёмая — Вялікае Княства Літоўскае.

## Яшчэ можна трапіць у Нарвілішкі

Тэрмін падачы дакументаў на візу для наведнікаў фэсту «Be2gether» працягнуты. Іх будуць прымаць да 5 чэрвеня ўключна ў сувязі з вялікім наплывам наведнікаў.

Умовы атрымання бясплатнай візы не змяніліся: дастаткова прадставіць квіток і яго ксеракопію, а таксама фотаздымак, медыцынскую страхоўку і запоўненую анкету. Віза выдаецца на тэрмін з 11 па 15 чэрвеня.

Нагадаем, сёлета фестываль «Be2gether» адбудзецца з 12 па 14 чэрвеня. Хэдлайнерамі ў гэтым годзе будуць **«Gogol Bordello»** (ЗША), **«Clawfinger»** (Швецыя), **«Touch And Go»** (Вялікабрытанія), **«Polarkreis 18»** (Нямеччына), **«Roni Size»** (Вялікабрытанія), **«Dilated Peoples»** (ЗША). Беларусь прадставяць **«Ляпис Трубецкой»** і **«The Toobes»**.

Машынай да Нарвілішак ад Мінску 200 км. па маршруце Ліда — Шальчынінкай — Дзевянішкес — Даўлянай — Нарвілішкес. Галоўнае — не забыць аформіць аўтамабільную страхоўку (30 еўра).

Можна дабрацца да Вільні аўтобусам (7.20, 8.20 з Мінску) ці цягніком (6.30 з Мінску). 12 чэрвеня з віленскага аўтавакзалу ў 11.00, 12.00, 13.40 і 14.35 выпраўляюцца фестывальныя аўтобусы да Нарвілішак. Кошт праезду 18 літаў (каля 20 тыс. рублёў).

Квіток на ўсе дні фестывалю каштуе 160 тыс. руб. Набыць іх можна праз тэлефоны (029) 655–55–96, (033) 655–55–96, а таксама праз сайт www.soundline.by і ў канцэртных касах Мінску.

## ІМПРЭЗЫ

### Прэзентацыя «Сучаснага шведскага апавядання»

**9 чэрвеня а 18-й у Палацы мастацтваў (вул. Казлова, 3)** адбудзецца прэзентацыя зборніку «Сучаснае шведскае апавяданне». Удзел бяруць Зміцер Вайцюшкевіч, Віктар Шалкевіч, Стэфан Эрыксан, Валянцін Акудовіч.

### pARTisan на Белэкспа

Прэзентацыя дзевятага нумару культурніцкага альманаху «pARTisan» «Горад Сонца–2» адбудзецца **4 чэрвеня ў будынку «Белэкспа» (вул. Янкі Купалы, 27)** на «Беларускім павільёне 53–й Венецыянскай біенале» **на другім паверсе цэнтральнай пляцоўкі экспазіцыі**. У імпрэзе возьмуць удзел галоўны рэдактар альманаху Артур Клінаў, архітэктар Уладзімір Папруга, старшыня Таварыства аховы помнікаў Антон Астаповіч. **Пачатак у 17.30.**




## КАНЦЭРТЫ

### Бартосік у Магілёўскіх каледжах

**3 чэрвеня** бард Зміцер Бартосік выступіць **у Магілёўскім электратэхнічным каледжы. Пачатак выступу ў 14.30. 4 чэрвеня** барда чакаюць **у Магілёўскім політэхнічным каледжы. Пачатак таксама ў 14.30.**

### Трыо «Вытокі»

З нагоды юбілеяў славутых кампазітараў Фларыяна Міладоўскага і Станіслава Манюшкі трыо «Вытокі» выступіць з канцэртамі ў межах праграмы «Тут узрастала муза твая». **3 чэрвеня, Аграрны ліцэй Смілавіч. Пачатак у 15.30. У той самы дзень** Аляксей Фралоў (фагот), Ірына Аўдзеева (фартэпіяна) і Сяргей Махаў (флейта) зайграюць **у санаторыі «Волма» фальварку Убель. Пачатак а 17-й.**

### «Крама» ў Гродне

Канцэрт гурту ладзіцца **4 чэрвеня ў гродзенскім ліцэі №1. Пачатак а 19-й.**

### Алесь Камоцкі ў Купалаўскім музеі

Алесь Камоцкі запрашае ўсіх: і тых, хто ведае, у чым справа, і тых, хто не ў курсе, паслухаць старых і новых песень **9 чэрвеня ў 19.00. Уваход вольны.**

### Jazz-Jazz

Першы сумесны канцэрт джазавых музыкантаў **«Diagilew project»** (Германія) з удзелам вядомага джазавага піяніста **Канстанціна Гарачага** («Apple Tea») і беларускай этна–джазавай групы **«Akana-NHS»** пройдзе **5 чэрвеня на сцэне сталічнага Моладзевага тэатру эстрады (вул.Маскоўская, 18а)**. Упершыню ў Беларусі нямецкі джаз і беларускія этнічныя песні загучаць разам. П**ачатак а 19-й.**

### Пяць беларускіх гуртоў у Расіі

Сёлета на расійскім альтэрнатыўным фэсце «Пустые холмы — 2009» выступяць пяць гуртоў з Беларусі, а сам фэст пройдзе ў пяць дзён на пяці сцэнах. Штогод «Пустые холмы» змяняюць месца дыслакацыі. Канцэрты пройдуць **ад 10 да 14 чэрвеня за 300 км ад Масквы, але дакладнае месца не называецца**. Ходзяць чуткі, што пад Смаленскам. **З Мінску на фэст выправіцца аўтобус.** «Пустые холмы» маюць статус самага незвычайнага расійскага фэсту. «Трапіць на фэст можа кожная група, абы грала ўжывую і мела сваю разынку», — заяўляюць арганізатары. Сёлета ў праграме выступы гуртоў **«Умка и Броневичок»**, **Jah Division**, з Беларусі — **«Адыс Абеба»**, **«Маланка Orchestra»**, **«ПУК-СТБэнд»**, **CherryVata** і **The Worm Ouroboros**. **Аўтобус з Мінску паедзе з ст.Дружная 11 чэрвеня раніцай, а назад у Мінск прыедзе 14 чэрвеня ўвечары.** Кошт туру — 80 у.а. Замовіць квіткі на тур можна праз т.: (029) 278–32–16, (029) 121–25–24.

**«ТГ»**

## ВЫСТАВЫ

### Фотавыстава «Нашыя дзеці»

Фотавыстава «Нашыя дзеці» працуе **ў кавярні «Стары Мінск» (пр. Незалежнасці, 14)**. Прадстаўленыя працы Ксеніі Авімавай, Аляксандра Васюковіча, Таццяны Гаўрыльчык, Таццяны Зяньковіч, Андрэя Лянкевіча, Хрысціны Карчэўскай.

### Адкрыццё Беларускага павільёну Венецыянскай біенале

Другі раз за ўсю гісторыю Венецыянскай біенале беларускія мастакі возьмуць у ёй удзел: у Мінску адкрываецца неафіцыйны Беларускі павільён 53–й Венецыянскай біенале. У экспазіцыі творы 30 беларускіх мастакоў, скульптараў і фатографаў розных пакаленняў. **Выстава пройдзе у НВЦ «БелЭКСПА» (вул. Я. Купалы, 27) ад 3 да 6 чэрвеня.**

## ТЭАТРЫ

### 3 чэрвеня

**Купалаўскі тэатр, малая сцэна** — «Дамскае танга»
**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»
**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Выспа нашай любові і надзеі»

### 4 чэрвеня

**Купалаўскі тэатр, малая сцэна** — «Апельсінавае віно»
**Музычны тэатр** — «Юнона і Авось»
**Тэатр юнага гледача** — «Пацалунак ночы»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Выспа нашай любові і надзеі»

### 5 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Прынцэса цырку»
**Тэатр оперы і балету** — «Князь Ігар»
**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Тэатр купца Япішкіна»

### 6 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Даратэя»
**Лялечны тэатр** — «Васіліса Прыўкрасная»
**Тэатр оперы і балету** — «Шчаўкунок»
**Тэатр імя Горкага** — «Анджэла і іншыя»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Поле бітвы»

### 7 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Залатое кураня»
**Музычны тэатр** — «Нябесны ціхаход»
**Лялечны тэатр** — «Пэпі Доўгая панчоха»
**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце — лепей»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Поле бітвы»

### 9 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Бабскі бунт»
**Лялечны тэатр** — «Вясёлы цырк»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сталіца Эраўнд»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»
**Тэатр оперы і балету** — «Багема»

### 10 чэрвеня

**Купалаўскі тэатр** — «Хам»
**Купалаўскі тэатр, малая сцэна** — «Старамодная камедыя»
**Музычны тэатр** — «Севастопальскі вальс»
**Лялечны тэатр** — «Прыгоды алавянага жаўнерыка, пастушкі і камінара»
**Тэатр імя Горкага** — «Несапраўдны хворы»
**Тэатр юнага гледача** — «Падарожжа ў царства сноў»

### 11 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Рускі фантом»
**Лялечны тэатр** — «Марозка»
**Тэатр імя Горкага** — «Дзядзькаў сон»
**Тэатр юнага гледача** — «Дарога на Віфлеем»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»
**Купалаўскі тэатр** — «Хам»
**Купалаўскі тэатр, малая сцэна** — «Старамодная камедыя»

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Уверх!

Амаль адразу па прэм'еры ў Канах амерыканскі мультфільм «Уверх» з'явіўся на беларускіх экранах.

Пенсіянер Карл Фрыдрыхсан, якога збіраюцца выправіць у дом састарэлых, не мірыцца з лёсам. Ён надзімае паветраныя балонікі і ляціць разам з сваім домам і хлопчыкам–следапытам у Паўднёвую Амерыку, каб здзейсніць мару памерлае жонкі. Прыгодаў хопіць на ўсіх: дзікія джунглі, гаваркія сабакі, каляровая птушка шчасця, бойка на мячах і страшныя househpасткі.

Мультфільмы студыі «Піксар» сталі анімацыйным эталонам. «У пошуках Нэма», «Валлі» — камп'ютэрна–лялечныя героі рабіліся ўсё жывейшымі і мудрэйшымі. Хаця, куды ўжо болей.

У дзіцячай карціне ўсё для дзяцей: пацешная птушка, хлопчык–недарэка, сабакі на самалётах і процьма каляровых балонікаў.

У дзіцячай карціне ўсё для матуляў і дзядуляў. Жыццё чалавека ад дзяцінства да старасці паказанае ў дасціпным, зразумелым нават немаўляці пластычным эцюдзе. У карціне ёсць мудрасць сталення: дзіцячы кумір ператвараецца ў пыхлівага нягодніка, а ціхае сямейнае жыццё само становіцца прыгодай. У жыцці заўжды ёсць месца спачуванню і дабру.

**Андрэй Расінскі**






# Якасная адукацыя для Вашых дзяцей



PHOTO.BYMEDIA.NET

У наступным нумары «НН» — інфармацыя пра ўсе беларускамоўныя садкі сталіцы.

**Пачынаецца набор у першыя класы. Сем мінскіх школ прапануюць навучанне па-беларуску.** Іх перавага — інтэлігентны падбор дзяцей, невялікія класы, гімназічныя праграмы. Вашы малыя будуць вучыцца з дзецьмі дзеячаў культуры, бізнэсоўцаў, дактароў, навукоўцаў. Менавіта гэтае асяроддзе выбірае беларускамоўныя школы ў сталіцы. Прапануем падрабязную інфармацыю, адрасы і кантакты.

### Гімназія № 4 (вул. Кунцаўшчына, 18)

Для прыёму дзяцей у першы клас іх законныя прадстаўнікі падаюць:

заяву на імя дырэктара гімназіі;

копію пасведчання аб нараджэнні дзіцяці;

даведку аб стане здароўя дзіцяці (форма № 026-У);

пашпарты бацькоў ці асобаў, што іх замяняюць, прад'яўляюцца асабіста.

Ад 2 да 6 чэрвеня — уступныя іспыты ў 5-я гімназічныя класы.

Даведкі: 315–33–83, 258–49–71, 258–49–74; e–mail: gymn4@minsk.edu.by.

### Гімназія № 9 (вул. Сядых, 10)

арганізуе прыём дакументаў у 1 клас **ад 1 чэрвеня да 28 жніўня**. Звяртацца ў каб. 22. Гімназія прапануе: вывучэнне ўсіх прадметаў на беларускай мове; вывучэнне англійскай, польскай, нямецкай моваў на факультатыўных занятках; прадметы музычнай накіраванасці; дадатковыя адукацыйныя паслугі за кошт факультатыўных заняткаў і платных паслуг.

Прымаюцца дзеці, якія пражываюць у Мінску. Пры адсутнасці мінскай прапіскі неабходна ўзгадніць прыём дзіцяці з упраўленнем адукацыі Першамайскага раёну.

Даведкі: (017) 283–04–21, 281–38–04.

### У гімназіі № 23 (пр. Незалежнасці, 45)

камісія па прыёме дакументаў у 1 клас працуе: **у няцотныя дні (I змена) — 10.00—14.00, цотныя дні (II змена) — 15.00—19.00, у першую суботу чэрвеня — 10.00—12.00.** Звяртацца ў каб.21.

Ад 2 да 6 чэрвеня вучні здаюць уступныя іспыты ў 5-я гімназічныя класы: 2 чэрвеня — беларуская мова (дыктоўка); 4 чэрвеня — матэматыка (кантрольная работа); 6 чэрвеня — расійская мова (дыктоўка).

Ідзе і дадатковы набор на вольныя месцы ў 6 — 11 класы.

Даведкі: (107) 284–51–26, 284–87–16.

### У гімназіі № 28 (пр. Ракасоўскага, 93)

ад 2 да 6 чэрвеня пройдуць уступныя іспыты ў 5-я гімназічныя класы. Усе прадметы ў гімназіі выкладаюцца на роднай мове, паглыблена вывучаецца французская мова.

Даведкі: (017) 248–32–02, 248–12–64, e–mail: sch2@minsk.edu.by.

### Гімназія № 14 (вул. Васняцова, 10)

прымае заявы ў беларускамоўныя 1 класы. Прапануецца паглыбленае вывучэнне замежных моваў, спецкурсы па міфалогіі, псіхалогіі, асновах эканамічных ведаў, журналістыцы. Дзейнічаюць фальклорны ансамбль, музеі, літаратурная студыя і студыя бальных танцаў.

Іспыты ў 5-я гімназічныя класы — ад 2 да 6 чэрвеня.

Даведкі: (017) 295–01–33, 295–21–31.

### СШ №190 (вул.Нікіфарава, 19)

ажыццяўляе прыём дакументаў у першыя класы **ад 1 чэрвеня да 28 жніўня (настаўніцкая (I паверх) у панядзелак (10.00—14.00), сераду (16.00-20.00), пятніцу (10.00-14.00), суботу (10.00-13.00))**. Выкладанне адбываецца на беларускай і расійскай мовах. Школа прапануе бясплатную музычную адукацыю і спартыўныя секцыі.

Даведкі: (017) 260–24–90; e–mail:sch190@minsk.edu.by

### СШ № 60 (вул. Лібкнехта, 82)

чакае першакласнікаў у беларускія класы. Школа мае музычную скіраванасць.

Даведкі: (017) 208–69–74, 209–94–49.

**Сямён Печанко**

«БЕЛСАТ»: ТЭЛЕПРАГРАМА НА 8—14 ЧЭРВЕНЯ

## «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 8 чэрвеня, панядзелак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Ранча», серыял: 31 серыя
**19.00** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Ці існаваў старажытнарускі народ?» (спазнаваўчая праграма)
**19.05** «Ісабель Альендэ», дак. фільм, 2007 г.
**20.05** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**20.35** «Бульбаны», мультсерыял
**20.40** «Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў», 12 серыя: «Made in Ukraine»
*У чарговай серыі цыклу аўтары знаёмяць гледача з прамысловым патэнцыялам Украіны і паказваюць нам «сэрца цяжкой прамысловасці» краіны — Данбас, дзе здабываюць вугаль і плавяць сталь. Цыкл ствараецца на аснове матэрыялаў ад Еўрапейскай Камісіі.*
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.20** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**21.35** «Сонечная дзяржава», рэж. Марцін Шулік, 2005 г., Чэхія.
**23.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 3 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 9 чэрвеня, аўторак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 3 серыя
**18.55** «Чацвёртая сусветная вайна», дак. фільм, рэж. Рык Роўлі, 2003 г., ЗША
**20.15** «Акно ў Еўропу» (інфармацыйная праграма)
**20.40** Паштоўка з Вільні (праграма пра беларусаў у Літве)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Маю права (прававая праграма)
**21.35** Форум (ток–шоу): Ці лёгка быць маладым?
**22.20** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**22.50** Госць «Белсату»: Павал Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**23.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 4 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 10 чэрвеня, серада

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 4 серыя
**18.55** «Басовішча–2007» — рок ці рэвалюцыя», рэпартаж
**19.20** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**19.35** «Апошні сезон», серыял: 6 серыя
**20.25** Праект «Будучыня» (навукова–папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Рэпартэр (інфармацыйная праграма)
**21.40** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Ці існаваў старажытнарускі народ?» (спазнаваўчая праграма)
**21.50** «Не кажы маме, што нянька памерла», маст. фільм, рэж. Стывен Гэрэк, 1991 г., ЗША.
*Моладзевая камедыя. Пяцёра няпоўнагадовых застаюцца адны дома, бо маці едзе ў Аўстралію, а даглядаць дзятву запрашае няньку. Аднак па волі лёсу дзеці застаюцца і без дагляду, і без сродкаў. Старэйшая сястра Сью Элен бярэ на сябе адказнасць за малодшых братоў і сёстраў, спрабуючы зарабіць грошай на ежу і пражытак...*
**23.35** «Аляксандр Ісачоў. Майстар і Афрадыта», дак. фільм, 2008 г., Беларусь
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 11 чэрвеня, чацвер

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Не кажы маме, што нянька памерла», маст. фільм, рэж. Стывен Гэрэк, 1991 г., ЗША.
**20.00** «Вызваленне», дак. фільм, рэж. Вольга Нікалайчык, 2008 г., Беларусь, ч. 1
**20.30** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Хто ёсць кім: «Думай пра добрае» (Ганна Хітрык)
*Ганна нарадзілася на «старое» Купалле — 25 чэрвеня. У 1998—2001 гг. вучылася ў Акадэміі мастацтваў на акторку тэатру лялек. Трэцякурсніцаю яе запрасілі ў Купалаўскі тэатр... Цяпер яна адна з самых запатрабаваных мінскіх актораў: грае ў Сучасным мастацкім тэатры, у ТЮГу, спявае ў гурце «Дзецідзяцей».*
**21.30** Дакументальная гадзіна: «Народжаныя для прытонаў», дак. фільм, рэж. Зана Брыскі, 2004 г., ЗША
**22.55** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 10 серыя
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 12 чэрвеня, пятніца

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 10 серыя
**19.00** Праект «Будучыня» (навукова–папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**19.30** Невядомая Беларусь: «Дай у рай, маці, ключы», дак. фільм, рэж. Юрый Выдронак, 2008 г., Беларусь
*Беларуская вёска. Раніца. Поле. У кадры з'яўляецца пастухоў ражок на фоне ўсходу сонца. Тым часам у вёсцы гаспадары збіраюцца першы раз сёлета выганяць жывёлу на пашу. Гэта цэлы рытуал...*
**19.45** «Minsk–Mixt—2008», ч. 2: канцэрт гурту «Фляўс і Кляйн»
**20.15** Рэпартэр (інфармацыйная праграма)
**20.40** Кінастужка (агляд кінарынку)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.15** Госць «Белсату»
**21.30** «Girl guide», маст. фільм, рэж. Юліюш Махульскі, 1995 г., Польшча
**23.05** «Апошні сезон», серыял: 7 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 13 чэрвеня, субота

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выпуск)
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**18.40** «Закаханыя ў Мінску», дак фільм, рэж. Ульф фон Мэхаў, 2003 г., Нямеччына
**20.10** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**20.35** Кухня (музычна–публіцыстычная праграма)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўны выпуск)
**21.10** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Дзеці піраміды», дак. фільм, рэж. Ганна Вянцкоўска, 2007 г., Польшча
*Дзеці з бедных сем'яў на паўночным усходзе Польшчы падчас летніх вакацый працуюць экскурсаводамі і паказваюць турыстам мясцовыя помнікі прускага дойлідства. Пасля II сусветнай вайны тут стварылі саўгасы, якія пасля змены палітычнай сістэмы развaліліся. Гэтыя людзі ніколі не працавалі ва ўмовах свабоднага рынку і ў новых эканамічных варунках разгубіліся.*
**21.45** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»)
**22.10** Суботні сеанс: «Бездакорныя анёлкі», маст. фільм, рэж. Тымаці Бонд, 1998 г., Канада—ЗША.
*Элэйн праязджае з дачкою–падлеткам у спакойнае мястэчка, пра якое яна заўсёды марыла. Але неўзабаве дзяўчына выяўляе, што атмасфера ў мястэчку занадта ідэальная. І калі ты не падпарадкоўваешся правілам, ёсць толькі адно выйсце — смерць.*
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 14 чэрвеня, нядзеля

**18.00** Прэс–экспрэс
**18.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 5 серыя
**19.05** Жаўтуха (сатырычная праграма)
**19.35** «Дзе мае бацькі? Пакінутыя дзеці ў Румыніі», дак. фільм, 2008 г., Румынія
*Гэтыя дзеці не сіроты, але гадамі не бачаць сваіх бацькоў. Пасля ўваходу Румыніі ў Еўрасаюз два мільёны румынаў, прываблены заходнімі заробкамі, пакінулі краіну і сем'і. Які кошт яны плацяць у пагоні за дабрабытам?*
**20.10** Форум (ток–шоу): Куды пайсці вучыцца?
*Наколькі даступная ў Беларусі вышэйшая асвета? Ці адпавядае нашая адукацыя сучасным патрабаванням? Шараговая сярэдняя школа не здольная падрыхтаваць свайго выпускніка да паступлення ва універсітэт. Гэтая справа — у сферы шэрага рынку рэпетытарства?*
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Крыжакі»
*XIII стагоддзе сталася для беларускіх земляў часам цяжкіх выпрабаванняў. Адразу з двух бакоў ішла ваенная навала: з поўдня пагражала Залатая Арда, а з захаду — Тэўтонскі ордэн.*
**21.25** «Акно ў Еўропу» (інфармацыйная праграма)
**21.50** Фільматэка майстроў: «Дэраў», біяграфічная драма, рэж. Джон Дэйвід Коўлз, 1991 г., ЗША.
*1894 год, Чыкага. Карпаратыўны юрыст Клэранс Дэраў (у выкананні Кевіна Спэйсі), які прадстаўляе інтарэсы кіраўніцтва чыгуначных кампаніяў, раптоўна пераходзіць на бок прафсаюзаў і пачынае бараніць працоўных... Фільм, створаны паводле біяграфіі легендарнага адваката і гуманіста XIX—XX стст., закранае праблемы міласэрнасці, а таксама пытанне дэтэрмінаванасці чалавечага існавання.*
**23.35** XIV Фестываль песеннай паэзіі і аўтарскай песні «Бардаўская восень—2007»: «WZ–Аркестр», ч. 2
**00.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)



# Б’ем у бубен — і крызіс адступае

**Даўно ўжо народ у форме чутак пра дэвальвацыю не выдаваў на гара столькі фальклору. Фельетон Лёліка Ушкіна.**

— Прафесія? — спытаў чалавек за стойкай гасцініцы.

— Этнаграфічная экспедыцыя, — адказаў кліент.

Парцье ўзняў на госця вочы.

— А, ясна. Пальчыкі катаць будзеце? Усё тэрарыста шукаеце?

— Не, вы не зразумелі. Збіраю дыяменты народнай творчасці. Ну, там, тосты, казкі, абрады, чуткі... Міф пра саюзную валюту, напрыклад. Гавораць у вас пра такое старыя людзі?

— Чуткі? Дарагі, табе выключна пашанцавала! Ёсць у мяне адна суперчутка...

Ён адвёў этнографа ў падсобку і зашаптаў таму ў дыктафон:

— Слухай пра дэвальвацыю. Чыстая праўда! Кажуць, што валюты ў сховішчах Нацбанку на два тыдні. Хутка усё ляснецца! Праз тыдзень курс будзе 3500! Уяўляеш? Так што бяжы хутчэй баксы набываць. Трэба ўсім рабіць рытуальны абмен.

Малады чалавек аж заплакаў:

— Зайчыка шкада.

— Мне даклалі, што вы этнограф, — рэзкім рухам адчыніўшы дзверы, увайшоў чалавек у дарагім касцюме.

Студэнт радасна заківаў галавою:

— Так! І я мару запісаць які-небудзь рэдкі народны абрад, а ўзяць удзел у ім было б проста фантастычна!

— Дарагі, табе выключна пашанцавала. Як наконт таго, каб узяць удзел у абрадзе «Выбіванне крэдыту ў Расіі»?

— Ваў! А ў чым яго сутнасць?

— Гэта даўні прыгожы абрад. Спачатку мы праводзім пасяджэнне па бягучых праблемах сацыяльна-эканамічнага развіцця. Нас — супрацоўнікаў ураду — будуць пясочыць. Мы на гэта маем ківаць галовамі і нешта запісваць. Ёсць павер’е, што падобныя пасяджэнні выводзяць краіну з крызісу. Пасля мы б’ем у бубен на нашых тэлеканалах, прамаўляем словы заклінанняў перад расійскімі журналістамі, і ўрэшце нам даюць крэдыт, а крызіс адступае, пераможаны нашымі чарамі.

Студэнт быў у захапленні. У гэтым кутку Еўропы захаваліся такія цікавыя народныя традыцыі! Яго праца будзе прарывам у этнаграфіі.

— А ў чым мая функцыя? — спытаў ён.

Чыноўнік трохі памаўчаў.

— Чым больш Галоўны Шаман будзе нас пясочыць, тым мацнейшая эфектыўнасць рытуалу. Таму трэба напярэдадні выклікаць у яго жудасную ярасць. Публічна сказаць, што беларускай гаспадарцы капцы, што дэфолт непазбежны...

— А, я чуў пра гэта! Мая рытуальная роля называецца «Кудрын»!

— Так. Аднак вы мусіце быць гатовым да таго, што Галоўны Шаман будзе вас крытыкаваць, на словах церці ў парашок, называць бруднымі словамі.

Студэнт пабег рыхтавацца да выступу.

Чыноўнік на ўсякі выпадак прашаптаў замовы ад дзяржкантролю і дзяржбяспекі і скіраваўся да свайго лімузіну. Замову ад аўтаінспекцыі не прамаўляў — у яго быў ахоўны амулет, прымацаваны на лабавым шкле. Замовы ад Галоўнага Шамана, на жаль, не існавала.

## ЛЕВЫМ ВОКАМ



## АДЛУПЫ

### «Шведскі ранак»

*«Вядучыя «Нашего утра» на АНТ Лушчык ды Кашчэеў запрасілі ў госці пасла Швецыі. Ён гаварыў з імі па-беларуску, а яны з ім размаўлялі па-расійску».*
***«Наша Ніва»***

Задума, зрэшты, добрая была:
— Праграму трэба нам абеларусіць.
А для пачатку
Шведскага пасла
Для інтэрв’ю паклікаць варта, мусіць,
Бо нашу мову вывучыў пасол.
Дык, мовіць так, яму і ў рукі карты.
А каб не атрымаўся ў нас «пракол»,
Вядучым мову падвучыць бы варта.
І тут вядучых ахапіў спалох.
Ад роспачы Кашчэеў толькі войкаў:
Звязаць на мове і двух слоў не мог,
Была адна адзнака ў школе — двойка.
Хоць быў знаёмы ўвесь гламурны свет,
Калені задрыжалі ў Люсі Лушчык:
На мове роднай размаўляць як след —
Не семечкі на дыскатэцы лушчыць.
Ды што паробіш, калі ёсць загад...
І вось на тэле запрасілі шведа.
На мове гаварыць ён дужа рад
(Хоць некалі яе зусім не ведаў).
Вядучыя ж на мове — «пык» ды «мык»,
І ўрэшце не адужалі нагрузкі:
— Какой-то очень трудный сей язык,
Мы будем с Вами говорить по-русски.
Глядзець і слухаць — проста смех і здзек,
З вядучых насміхалася краіна.
***
У штат жа лепей возьмем мы пасла,
Няхай ён будзіць моваю з экрану.
І перадача б новая пайшла:
Заместа «Наше утро» —
«Шведскі ранак».

**Алесь Няўвесь**




**Атамная энергетыка наклала адбітак на твар кіраўніка Акадэміі Навук Міхаіла Мясніковіча (справа). Злева — міністр фінансаў Андрэй Харкавец, у цэнтры — Пятро Пракаповіч перад сустрэчай з Кудрыным.**

## З ПАДСЛУХАНАГА

***

На аўтобусным прыпынку размаўляюць дзве жанчыны.

— А ці чула ты, учора ж Валерка новую дзеўку дамоў прывазіў?

Другая, не даслухаўшы, перабівае:

— Ды дзе я табе чула, я ж учора ў касцеле не была.

***

Размаўляюць два хлопцы.

— Валера, ты ўчора на танцах быў?

— Не, учора не піў.

***

Цётка Агата апавядае сваёй суседцы пра святочную імшу ў касцёле:

— А ўчора як пекна было ў касцеле, Божа ратуй!

**Запісаў Зміцер Лупач**

## ЖАРТЫ

***

У малодшых класах хлопчыкі б’юць прыгожых дзяўчынак сумкамі па галаве, а потым здзіўляюцца, чаму ўсе прыгожыя дзяўчаты — дурніцы.

***

Аб’ява: «Шаноўныя пакупнікі! У сувязі з фінансавым крызісам наш буцік пераехаў назад на рэчавы рынак «Ждановічы».

***

Той, хто вывучыў англійска-беларускі слоўнік, ведае англійска-беларускую мову.

***

Навіна планетарнага маштабу: сацыялістычная Паўночная Карэя пагражае капіталістычнай Паўднёвай Карэі вайной на знішчэнне, калі тыя не возьмуць іх да сябе!..

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Старадаўні гэта звычай на Сёмуху ўбіраць хаты і падворкі бярэзінай. Але ці маем старадаўнія лясы? Іх ужо не стала. Старадаўнія звычаі трэба любіць і шанаваць, толькі калі яны разумныя. Падумайце, колькі бярэзін прападзе?

**«Наша Ніва». №21. 1909**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ПРЫЗНАННЕ

**Вольга Паўлаўна, я цябе кахаю.** Як мне дабіцца тваёй прыхільнасці? Аляксей Мікалаевіч

### СТУДЭНЦКІ КОНКУРС

**Распавядзі нам сваю праўду** пра сесію! Дашлі на zbs.info@gmail.com фота альбо відэа (не болей за 5 хв.), прысвечаныя названай тэме, і вазьмі ўдзел у конкурсе «Голая студэнцкая праўда пра сесію». Аўтары самых незвычайных і цікавых прац атрымаюць прызы. Дэдлайн 5 чэрвеня!

### АРШАНСКАЯ БІТВА

**Працягваецца падрыхтоўка** да фэсту беларускай аўтарскай песні і паэзіі «Аршанская Бітва». Запрашаем беларускіх выканаўцаў да ўдзелу ў народным свяце. Для інфармацыі: vorsafest.livejournal.com. Сувязь: vorsha2009@gmail.com

### КОЗЫ

**Прадам** 2 казы. Т.: (017) 212-35-44.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

**Наша Ніва**
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914),
Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч,
У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6000. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 01.06.2009.
Замова № 2940.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.
Цана дамоўная.
ISSN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

9771819161008 09021